№ 5 (555) 7 лютага 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Палітвязьні ў абмен на што?

Аляксандар Лукашэнка вядзе сэпаратныя перамовы зь Нямеччынай і Францыяй. Вынікам іх стала вызваленьне некалькіх палітвязьняў.
Старонкі 3—5.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## У НУМАРЫ

**Украіна ўступіла ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю**

Чым гэта пагражае Беларусі, і калі нашая краіна далучыцца да СГА? Інтэрвію з экспэртам.
**Старонка 5.**

**Бжазінскі падтрымаў Абаму**

Хто за каго ў перадвыбарнай гонцы ў Амэрыцы?
**Старонка 6.**

**Velcom: 360 мільёнаў на вецер**

Інтрыга, зьвязаная з продажам «Мабільнай лічбавай сувязі» атрымала нечаканы працяг.
**Старонка 8.**

**Закон dura. А мы?**

Для нашага грамадзтва панятак свабоды слова, як і ўвогуле любой іншай свабоды, пакуль што мала што значыць. Піша Віталь Тарас.
**Старонка 12.**

## Нашаніўцы ў Верхнядзьвінску, Гарадку і Віцебску

**9 лютага** рэдактар часопісу ARCHE **Валер Булгакаў** і пісьменьніца **Наталка Бабіна** наведаюць **Верхнядзьвінск**. **Пачатак сустрэчы ў 11.00**, даведкі праз т.: (029) 518-74-19 (Валянціна). **У той самы дзень** пройдуць сустрэчы **ў Гарадку (пачатак а 15-й**, даведкі праз т.: (029) 672-38-42 (Леанід) і **ў Віцебску (пачатак а 19-й**, даведкі праз т. (029) 323-98-46 (Віталь). У Гарадку і Віцебску да Булгакава і Бабінай далучыцца **Уладзімер Арлоў**.




**Зьміцер Жалезьнічэнка. Старонка 10.**

## Асаблівасьці сочынскіх трасаў, або Трое на аднаго

Чуткі спраўдзіліся: Лукашэнка і Пуцін сустрэліся ў Сочы. Дакладней, расклад быў «трое на аднаго». Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Паводле прэсавай службы беларускага кіраўніка, сустрэча 3 лютага ёсьць «лягічным працягам кантактаў у межах дамоўленасьцяў, дасягнутых у сьнежні 2007 г. у Менску». Пікантнасьць жа ў тым, што аналітыкі дасюль гадаюць, пра што два прэзыдэнты насамрэч дамовіліся тады. І чаму Пуцін у выніку выглядаў шчодрым, як сьвяты Мікалай (крэдыт на паўтара мільярды даляраў на льготных умовах, нафта па 119 даляраў на першы квартал сёлета і г. д.).

Што мог паабяцаць у сьнежні беларускі бок? Веер вэрсіяў — ад зялёнай вуліцы расейскаму капіталу (і ён ужо прэ, асабліва ў банкаўскую сфэру) да аб’яднальнага рэфэрэндуму.

Аўтар гэтых радкоў далёкі ад думкі, што айчыннае начальства ну проста сьпіць ды бачыць, як спрытней «здаць краіну». Але самае прыкрае тое, што ніводзін варыянт разьвіцьця падзей, уключна з самым незайздросным для лёсу незалежнасьці, ня можа быць выключаны. Няма празрыстасьці ў стасунках з Крамлём (рытуальным заклінаньням даўно ніхто не дае веры), няма гарантыяў нашага сувэрэнітэту (думаеце, калі што, Захад касьцьмі ляжа?), няма мэханізму грамадзкага кантролю над дзеяньнямі кіроўнае вярхоўкі (палітычнае поле ў краіне проста выпаленае).

**Працяг на старонцы 9.**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84

### КАМЭНТАРЫ

## «Лукашэнка вядзе з Захадам гульню на павышэньне ставак»

Палітоляг **Віталь Сіліцкі** пра перамовы Лукашэнкі зь Нямеччынай і Францыяй.

«Характэрна, што акурат пасьля сустрэчы Пуціна і Лукашэнкі ў Сочы дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА зьмясьціла вынікі цікавага апытаньня грамадзкай думкі. Зь іх вынікае, што Менск дасылае своеасаблівы сыгнал Маскве. То бок, нават калі Масква і «прапіхне» рэфэрэндум аб саюзнай дзяржаве, то ў Беларусі яго заваляць. Цалкам магчыма, што перамовы Лукашэнкі з Захадам усяго толькі гульня для павышэньня сваіх ставак. Для кіраўніка Беларусі кантакты з Захадам — гэта ізноў такі шантаж Масквы. Гэта ўсё вельмі добра кладзецца на лінію афіцыйнага Бэрліну на стабілізацыю дачыненьняў зь Менскам. Францыя, думаю, грае тут другую скрыпку, бо Усходняя Эўропа — дзялянка Нямеччыны. Францыя тут не праводзіць актыўнай палітыкі, а давяраецца Бэрліну».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

## Пракаповіч зрабіў палітычную заяву

Сярэдняя зарплата ў Беларусі павінна дасягнуць 1000 эўра да 2015 году. Права рабіць такія заявы ў беларускай сыстэме традыцыйна належыць аднаму чалавеку. Гэтым разам прагноз-заданьне выказаў старшыня Нацбанку Пятро Пракаповіч. Яшчэ адзін доказ таго, што патэнцыйнага папулярнага, а значыць, канкурэнта Сідорскага хочуць зьмяніць на пасадзе прэм’ера гэтым пазбаўленым лоску і палітычных амбіцый чыноўнікам. Так на чале палатаў нацыянальнага сходу А. Лукашэнка зьмяшчае самых бесперспэктыўных паплечнікаў, каб засьцерагчыся ад любых праяваў канкурэнцыі.

Менавіта Пракаповіч — банкір з будаўнікоў — выступіў з ініцыятывай лібэралізаваць правілы налічэньня заробкаў, прапанаваўшы пачаць з такога экспэрымэнту ў будаўнічай сфэры.

Калі Пракаповіч выйдзе ў прэм’еры, гэта яшчэ раз выявіць прынцып, паводле якога падбіраюцца кіраўнічыя кадры.

# Палітвязьні ў абмен на што?

Аляксандар Лукашэнка вядзе сэпаратныя перамовы зь Нямеччынай і Францыяй. Вынікам іх стала вызваленьне некалькіх зьняволеных.



БЕЛТА

У чацьвер 31 студзеня дзяржаўнае агенцтва БЕЛТА паведаміла пра сустрэчу кіраўніка Беларусі з паслом Нямеччыны ў Беларусі Гебхартам Вайсам **(на фота побач)**. Сустрэча была нечаканаю, а афіцыйная інфармацыя пра яе скамечанаю. А.Лукашэнка, што з гадамі стаў у пытаньнях знакаў і пратаколу пэдантам, прыняў пасла краіны, якая вызначае беларускую палітыку ЭС, у цікавым кантэксьце. Спатканьне адбылося напярэдадні палёту А.Лукашэнкі ў Сочы і па сьвежых сьлядах выхаду на волю трох палітвязьняў — вызваленых на аснове судовых рашэньняў, што выглядалі настолькі ж са столі ўзятымі, як і колішнія рашэньні пра іхнае зьняволеньне.

На сустрэчы А.Лукашэнка выказаў падзяку нямецкаму дыплямату «за ягоную працу ў краіне», а таксама зазначыў: «Ведаю, што гэтая сустрэча выкліча пэўнае незадавальненьне ў некаторых Вашых калег у Беларусі, але нам утойваць няма чаго. Удзячны за тую пазыцыю, якую Вы займаеце. Ведаю, што Вам нялёгка».

А.Лукашэнка лічыць пазыцыю некаторых эўрапейскіх паслоў у дачыненьні да Беларусі «парадаксальнай», «не зусім разумее» ролю паслоў краінаў ЭС і ЗША і нават ня хоча «гэтага ўтойваць». «Тое, што мы нікому ніякіх праблем не ствараем — ні суседзям, ні Нямеччыне, ні Францыі, ні ЗША, — гэта факт. Дык што ім ад нас патрэбна?» — перадала ягоныя словы прэс-служба.

Пасол Францыі Мірэй Мюсо ў панядзелак праясьніла сёе-тое ў гэтых эківоках падчас прэс-канфэрэнцыі. Адказваючы на пытаньне, што ў сьвятле адзінай палітыкі Эўрасаюзу ў дачыненьні да Беларусі азначае сустрэча беларускага прэзыдэнта і пасла Нямеччыны, спн. Мюсо зазначыла: «Існуе адзіная эўрапейская палітыка. І гэтая палітыка заключаецца ў тым, каб гаварыць пра неабходнасьць прадстаўленьня дэмакратычным сілам магчымасьці выказваць свае меркаваньні. Мы вітаем вызваленьне палітзьняволеных і спадзяемся, што будуць і наступныя вызваленьні. І мы ведаем, якую ролю ў гэтым вызваленьні адыграў спадар Лукашэнка. З прычынаў, якія б я не хацела тут тлумачыць, пасол Нямеччыны адыграў сапраўды асаблівую ролю, і я шчасьлівая, што ён гэтай сваёй асаблівай роляй прынёс нейкі ўклад у вырашэньне ўзгаданых мной пытаньняў».

Зьвярнула ўвагу, што Мюсо ў той жа дзень заявіла, што Францыя «гатовая супрацоўнічаць зь Беларусьсю ў справах пабудовы АЭС». Адказваючы на пытаньне пра магчымы ўдзел Францыі ў пабудове беларускай АЭС, пасол заўважыла, што яшчэ пры канцы 2006 г. яе папярэднік садзейнічаў наладжваньню кантактаў беларусаў з спэцыялістамі ў сфэры атамнай энэргетыкі зь берагоў Роны і Сены. Гэтую палітыку Францыя прадоўжыць, падкрэсьліла спн. Мюсо. «Цяпер, калі так можна сказаць, мяч як на баку тых, хто хацеў бы пабудаваць станцыю, так і на баку тых, хто мог бы яе пабудаваць».

Магла б — француская кампанія «Арэва», рэактары якой лічацца найдасканалейшымі — Францыя сама выпрацоўвае 80% электраэнэргіі на АЭС. «Упэўнена, што беларускія ўлады, улічваючы горкі досьвед чарнобыльскай катастрофы, прыкладуць максымум намаганьняў для забесьпячэньня бясьпекі праекту», — сказала пасол.

Да ліпеня Францыя прадстаўляе старшынёўства Эўрасаюзу ў Беларусі ад імя Славеніі. У другім паўгодзьдзі Францыя будзе старшыняваць ад свайго імя.

Для большасьці краінаў Эўрасаюзу сэпаратныя кантакты пасла Вайса сталі сюрпрызам. Мяркуецца, што гэ-



Пасол Францыі Мірэй Мюсо: «Мы ведаем, якую ролю ў гэтым [палітвязьняў Дашкевіча і Аўтуховіча] вызваленьні адыграў спадар Лукашэнка. Па прычынах, якія я б не хацела тут тлумачыць, пасол Нямеччыны адыграў сапраўды асаблівую ролю». Мюсо таксама заявіла, што Францыя гатовая супрацоўнічаць зь Беларусьсю ў справах пабудовы АЭС.

**Працяг на старонцы 5.**

# Артур Фінькевіч: Мы разьменныя манэты ў гандлі з Захадам

5 лютага выйшаў на волю чарговы палітвязень.

Самога Артура ў суд не прывезьлі. У залі паседжаньняў прысутнічалі Павал Севярынец, Вячаслаў Сіўчык, Зьміцер Дашкевіч, Алесь Міхалевіч, прадпрымальнік Алесь Макаеў, прадстаўнікі пасольства ЗША. Раніцай Севярынец, размаўляючы з карэспандэнтам «НН», стрымана выказаў надзею, што прысуд усё ж перагледзяць і вынесуць больш мяккі.

Але пракурор Каранькоў заявіў, што якраз прысуд Фінькевічу цалкам справядлівы, але пакараньне зажорсткае і запатрабаваў зьмяніць меру ўтрыманьня на 6 месяцаў «хіміі».

Судзьдзя Ігар Прошка падтрымаў пракурора, а паколькі дні, праведзеныя ў турме, ідуць у параўнаньні з «хіміяй» у прапорцыі 2/1, Артура мусілі выпусьціць адразу пасьля судовага паседжаньня. З судовай пастановай сябры палітвязьня накіраваліся да муроў ізалятара.

Некалькі гадзін вырашаліся юрыдычныя пытаньні. А 14-й Фінькевіч выйшаў на волю. «Многія думалі, што я буду скакаць ад радасьці, калі выйду з турмы, але асаблівага шчасьця не адчуваў. Стаўлюся да гэтага спакойна. Ламацца ў турме я не зьбіраўся», — кажа хлопец.

«Пра вызваленьне даведаўся за гадзіну перад тым, як пакінуў СІЗА, прыйшла адвакатка спн.Бахціна, яна мне і паведаміла рашэньне суду. Пра выхад з турмы Зьмітра Дашкевіча я ўжо ведаў, таму ў глыбіні душы спадзяваўся, што адпусьцяць ці хаця б скароцяць тэрмін», — кажа былы палітвязень.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Севярынец і Дашкевіч не спадзяваліся пабачыць Артура на волі аж так хутка.**

Нагадаем, у траўні 2006 г. хлопец быў асуджаны на два гады «хіміі» за палітычныя графіці. У пачатку сьнежня 2007 году, ён павінен быў выйсьці на волю. Але 20 сьнежня суд Кастрычніцкага раёну Магілёва асудзіў Фінькевіча на паўтары году турмы. Ён быў прызнаны вінаватым у парушэньні арт. 415 КК (ухіленьне ад адбыцьця пакараньня).

Вось як расказвае Фінькевіч пра паўторны арышт:

«Цяжка ў маральным пляне было толькі першы дзень. Я сядзеў у камэндатуры і чакаў пакуль з крамы прынясуць пяльмені. У пакой увайшлі ахоўнікі. Сказалі, каб зьбіраў рэчы, бо едзем у турму. Праз тры-чатыры гадзіны я быў ужо ў камэры. Скажам, на Валадарцы вязьня некалькі дзён трымаюць у «адстойніку», а тут адразу накіравалі ў «хату». У бытавым пляне ў Магілёве сядзець было лепш, чым на Валадарцы, але рэжым тут больш жорсткі».

Фінькевіч гаворыць, што супрацоўнікі КДБ неаднаразова папярэджвалі яго пра арышт. Хлопец на пэўным момантце нават зьмірыўся з тым, што трапіць за краты

«Папярэджвалі, што за дватры месяцы да вызваленьня зноў апынуся ў турме. У мяне пастаянна шукалі і чакалі парушэньняў. Тыя ж «хімікі», якім дапамагаў пісаць скаргі ці нешта яшчэ, пішуць на цябе дакладныя».

Пра сьнежаньскі суд Артур расказаў так: «У мяне калаціліся рукі і ногі, самаадчуваньне было вельмі кепскае. Нават нічога толкам ня мог сказаць. Міліцыянты казалі, што будзе пакараньне ад году да двух, таму прысуд не аказаўся нечаканым. За некалькі дзён да суду мне намякнулі: калі я прызнаю сваю віну, то нейкім чынам можна будзе дабіцца больш мяккага прысуду. Таму і была такая пазыцыя. Я вельмі ўдзячны сваёй адвакатцы Ганьне Бахціной, яна сапраўдны прафэсіянал».

Фінькевіч удзячны сябрам-маладафронтаўцам, прэсе і Аляксандру Мілінкевічу, якія ўздымалі тэму ягонага арышту на Захадзе, праводзілі акцыі салідарнасьці, не забываліся на яго.

«Разам з тым, разумею, што я, Дашкевіч, Аўтуховіч — проста разьменныя манэты ў гандлі з Захадам», — кажа хлопец.

Артур Фінькевіч зьбіраецца займацца грамадзкай дзейнасьцю, а таксама працягваць атрымліваць вышэйшую адукацыю ў ЭГУ, ён навучаецца на другім курсе, на аддзяленьні «Паліталёгія».

Ужо вечарам у аўторак Артур прыехаў у Менск, дзе ня быў амаль два гады.

**Зьміцер Панкавец,**
**Магілёў—Менск**

# Палітвязьні ў абмен на што?

Працяг са старонкі 3.

тую дыпляматычную ініцыятыву ён праявіў у згодзе толькі з пасламі Францыі і Італіі. Апошнія граюць тут другую скрыпку, бо Ўсходняя Эўропа — дзялянка Нямеччыны. «Зь неафіцыйных крыніц ведаю, што сустрэча пасла Вайса з Лукашэнкам выклікала шок і неразуменьне у Брусэлі», — сказаў нам палітоляг Дзяніс Мельянцоў.

«Лукашэнка вядзе з Захадам гульню на павышэньне ставак», мяркуе дырэктар Беларускага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў Віталь Сіліцкі. Характэрна, што акурат пасьля сустрэчы Пуціна і Лукашэнкі ў Сочы дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА зьмясьціла вынікі «апытаньня грамадзкай думкі», якое нібыта было праведзенае Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Зь іх вынікае, што беларусы схіляюцца да ўмацаваньня сувязяў з Захадам. «Для кіраўніка Беларусі кантакты з Захадам — гэта ізноў такі шантаж Масквы», — лічыць Сіліцкі.

Палітоляг Аляксандар Фядута больш аптымістычны. Ён упэўнены, што сустрэча А.Лукашэнкі з паслом Нямеччыны азначае пачатак дыялёгу з Эўропай. «Лукашэнка фактычна паскардзіўся Вайсу на падвойныя стандарты. Захад лепш ставіцца да Назарбаева з Карымавым, чым да Лукашэнкі. Той даводзіць, што ня горшы за сваіх калегаў і чакае да сябе адпаведнага стаўленьня».

Працяг ёсьць: у панядзелак адным росчыркам судзейскага пяра на волю быў адпушчаны Артур Фінькевіч. Больш за тое, ідуць чуткі аб вызваленьні такога заклятага асабістага ворага, як Казулін.

Апазыцыя, аднак, ня мае ілюзіяў наконт зьмены атмасфэры ў краіне. Агульная колькасьць асобаў, закранутых палітычнымі рэпрэсіямі, вырасла ў 2008 г. проці 2007-га на 40%. Овэррэакцыя на выступ прадпрымальнікаў супала зь немагчымым нават у ісламскіх тыраніях асуджэньнем журналіста Зьдзьвіжкова. Супрацоўнікі КДБ аказваюць псыхалягічны ціск на кожнага, хто спрабуе займацца арганізаванай палітычнай дзейнасьцю ў рэгіёнах. Адзначаныя першыя спробы абмежаваць свабоду выезду за мяжу, а па-над усім гэтым разрастаецца ідэалягічная вэртыкаль, якая фактычна ўяўляе зь сябе разгалінаваны апарат па лякалізацыі іншадумства. Выхад на свабоду групы палітвязьняў — заўважны жэст, які, аднак, нічога не мяняе ў сутнасьці беларускай сыстэмы самадзяржаўя.

Тым ня менш, Дзяніс Мельянцоў упэўнены, што плюсы дыялёгу пераважваюць мінусы. «Гэта адкрывае магчымасьці для новых сувязяў у палітыцы, эканоміцы, таму сустрэчу Лукашэнкі і Вайса можна ацэньваць пазытыўна».

**Мікола Бугай, Сямён Печанко, Зьміцер Панкавец**

# Украіна ўступіла ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю

Чым гэта пагражае Беларусі і калі нашая краіна далучыцца да СГА? Інтэрвію з экспэртам.

5 лютага прэзыдэнт Украіны і генэральны дырэктар Сусьветнай гандлёвай арганізацыі Паскаль Лямі падпісалі пратакол аб далучэньні нашай паўднёвай суседкі да СГА. Украіна стала шостай пасьля Малдовы, Грузіі і краінаў Балтыі дзяржавай былога СССР, што ўступіла ў сусьветную супольнасьць свабоднага гандлю. Украіна павінна ратыфікаваць пратакол аб уступленьні да 4 ліпеня. Гэта няпроста: канстытуцыйны хаос спаралізаваў працу Вярхоўнай Рады. Краіна ж стане паўнапраўным сябрам СГА толькі пасьля ратыфікацыі дакумэнту.

Беларусь таксама хоча ў СГА, але пакуль адолела хіба палову дарогі.

Пра ўступленьне Ўкраіны ў СГА і пэрспэктывы далучэньня да гэтай арганізацыі Беларусі гаворыць намесьніца дырэктара дасьледчага цэнтру Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту Ірына Тачыцкая.

Экспэрты: выйгрыш Украіны будзе роўны 1,5—1,7% ад гадавога ВУП.

**Ірына Тачыцкая:** У стасунках Беларусі і Ўкраіны далучэньне суседкі да СГА нічога ня зьменіць. Тэарэтычна, калі Ўкраіна далучыцца да Працоўнай групы СГА, то яна можа высоўваць нам прэтэнзіі. Але гэта малаімаверна.

**«НН»: На якім этапе ўступленьня ў СГА знаходзіцца Беларусь?**

**ІТ:** На сёньня мы атрымалі падтрымку дзесяці з дваццаці сябраў Працоўнай групы СГА. Але засталіся самыя прынцыповыя — ЗША і ЭС.

**«НН»: Справа ў палітычных ці эканамічных патрабаваньнях?**

**ІТ:** Пра палітыку ў СГА не гавораць, бо арганізацыя займаецца толькі эканомікай. Гэта своеасаблівы элітны клюб краінаў, па-за якім застаецца ўсё менш краінаў. ЭС, ЗША, Кітай, Індыя, Бразылія — усе асноўныя гульцы там. І ўдзельнікі гэтага клюбу дбаюць пра стандарты паводзінаў, якім навічкі павінныя адпавядаць.

**«НН»: Што атрымае Беларусь ад уступленьня ў гэты клюб?**

**ІТ:** Нашая эканоміка — адкрытая, арыентаваная на экспарт. Таму вырашаць шматлікія пытаньні ў сфэры міжнароднага гандлю было значна прасьцей у рамках СГА. Вырашацца праблемы розных антыдэмпінгавых расьследаваньняў, несправядлівых абмежаваньняў, напрыклад, у дачыненьні да беларускага тэкстылю. У хуткім часе да СГА далучыцца Расея. Наша адсутнасьць у арганізацыі ізноў жа нам будзе не на карысьць.

**«НН»: Ці згодныя Вы з думкай, што Ўкраіна зараз можа ўскладніць працэс далучэньня Расеі да СГА?**

**ІТ:** Такое магчыма, але ці патрэбна тое ўкраінцам. Выгадней вырашаць спрэчныя пытаньні, карыстаючыся мэханізмамі СГА, арыентаванымі на кампраміснае вырашэньне спрэчак.

**Гутарыў СП**

# Бжазінскі падтрымаў Абаму

## Хто за каго ў перадвыбарнай гонцы ў Амэрыцы?



Перадвыбарны «супэраўторак» у ЗША выявіў фаварытаў маратонскае гонкі за права стаць кандыдатамі ў прэзыдэнты ЗША. Моладзь фанацее ад Барака Абамы **(на фота)**, хоць ён так і не дагнаў дасьведчанай Хілары Клінтан.

Супэраўторкам у ЗША называюць дзень, калі выбарцы ў палове штатаў выбіраюць кандыдатаў ад партый на прэзыдэнцкія выбары. Звычайна пасьля яго выяўляюцца яўныя фаварыты ад Рэспубліканскай і Дэмакратычнай партый. Ня так сёлета.

У рэспубліканцаў, хоць 71-гадовы сэнатар Джон Маккейн у нацыянальных апытаньнях апярэджвае свайго найбліжэйшага суперніка Міта Ромні, барацьба далёкая ад завяршэньня.

У 2000 годзе Маккейн саступіў на перадвыбарах Бушу, цяпер жа ён мае ўсе шанцы стаць кандыдатам ад сваёй партыі. Паводле сваіх маральных, эканамічных і экалягічных поглядаў ён нашмат больш памяркоўны за Буша, хоць у замежнай палітыцы мае рэпутацыю прыхільніка сілавых мэтадаў. Трэба адзначыць, што Маккейна ня любяць нэакансэрватары і хрысьціяне-эвангелісты, якія складаюць электаральную базу рэуспубліканцаў. Зрэшты, пагроза перамогі зьненавіднай ім Хілары Клінтан напэўна змусіць іх мабілізавацца.

Працэдура выбараў свая ў кожным штаце і кожнай партыі. У галасаваньні бяруць удзел дзясяткі мільёнаў людзей — ня толькі актывістаў, а і прыхільнікаў. Доўгі перадвыбарчы маратон дазваляе добра прамацаць кандыдатаў і выпрабаваць іх на трываласьць. Мільёны людзей фінансуюць сымпатычных ім прэтэндэнтаў. Гэтак, кандыдат з дэмакратаў Барак Абама за адзін студзень месяц атрымаў каля 32 млн даляраў ад 165 тысяч ахвярадаўцаў.

Хто выйдзе пераможцам у дэмакратаў, прадказваць рана, хоць магутны партыйны апарат дае Клінтан фору. Яшчэ два тыдні таму лічылася, што яна мае жалезныя шанцы. Аднак магутны фінішны спурт Абамы зьмяшаў усе карты. Паводле сацыёлягаў, абое падышлі да чарговага этапу перадвыбараў з прыкладна аднолькавымі вынікамі, і лідэр вызначыцца толькі на пазьнейшых этапах кампаніі.

Інтрыга ў тым, што ні жанчына (Клінтан), ні афраамэрыканец (Абама), ні 71-гадовы палітык (Маккейн) ніколі раней не станавіліся кіраўнікамі наймагутнейшай дзяржавы сьвету. Гэта добра паказвае, як зьмяніліся Штаты, дзе калісьці палітыка і дзяржаўнае кіраваньне былі прывілеем белых мужчынаў, цесна зьвязаных з буйным капіталам. Цяпер нашмат большую ролю пачынаюць адыгрываць жанчыны і старэйшыя пэнсіянэры, а да меншасьцяў была выхаваная павага.

Маладыя выбарцы ў абсалютнай большасьці аддалі свае галасы Бараку Абаму — 46-гадоваму сэнатару з штату Ілінойс. Гэты маладжавы харызматык увасабляе для многіх «амэрыканскую мару». Народжаны ў надзвычай беднай сям’і, ён выбіўся ў людзі, бліскуча скончыў адзін з самых прэстыжных унівэрсытэтаў, аднак, у адрозьненьне ад большасьці сваіх аднагодкаў, пачаў кар’еру не з зарабляньня грошай, а з сацыяльнай работы ў родным Чыкага. Сваім эмацыйным стылем выступаў ён выклікае сымпатыю ня толькі афраамэрыканцаў. Дзеля Абамы ў перадвыбарах бярэ ўдзел рэкордная доля моладзі.

Абама заслужыў павагу дэмакратаў тым, што ад пачатку рашуча выступаў супраць уварваньня ў Ірак (Клінтан вайну напачатку падтрымала). Цяпер, калі вайна забрала жыцьці 4000 амэрыканцаў, 150 000 іракцаў, падарвала ваенную магутнасьць ЗША і спаскудзіла імідж краіны ў сьвеце, Абама зрабіў антываенную карту адной з асноваў сваёй кампаніі. Таксама ён выступае за перамену стылю вядзеньня палітыкі і палівае агнём вашынгтонскі істэблішмэнт.

Сярод галоўных тэмаў перадвыбарных дэбатаў у ЗША, акрамя вайны з ісламскім тэрарызмам, — пытаньні рэформы аховы здароўя, падатковай палітыкі, палітыкі ў сфэры іміграцыі.

Традыцыйна ў Амэрыцы вядомыя людзі адкрыта падтрымліваюць таго ці іншага кандыдата. Гэтак, да кампаніі Клінтан далучыліся рэжысэр Стывэн Сьпілбэрг, музыка Квінсі Джонз, сьпявачка Барбара Стрэйзанд, былая дзяржсакратарка ЗША Мадлен Олбрайт.

Маккейну далі падтрымку губэрнатар Каліфорніі Арнольд Шварцэнэгер і былы мэр Нью-Ёрку Рудольф Джуліяні.

А вось старэйшыны клану Кенэдзі, экс-кандыдат у прэзыдэнты Джым Керы, акторы Мэт Дэйман і Джордж Клуні, а таксама папулярная тэлевядоўца Опра Ўінфры падставілі плячо Абаму. Раскол прайшоў нават праз сем’і: за Абаму выступае на мітынгах жонка Шварцэнэгера Марыя Шрайвэр.

Абаму падтрымаў і найважнейшы лабіст Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы Зьбігнеў Бжазінскі. Былы памочнік прэзыдэнта Картэра ў нацыянальнай бясьпецы пабачыў у маладым сэнатару тыя ж рысы, якія калісьці былі ўласьцівыя ягонаму шэфу: увага да правоў чалавека і этычных праблемаў. Паварот Картэра да правоў чалавека і падтрымкі дэмакратыі ва ўсім сьвеце ў свой час перадвызначыў маральную перамогу Захаду над камунізмам. На думку Бжазінскага, такі лідэр патрэбны Амэрыцы, а зь ёю і ўсяму дэмакратычнаму сьвету сёньня ня менш, чым у 1976 годзе, пасьля фіяска ў Віетнаме.

Ад выніку выбараў залежыць лёс Іраку: Клінтан і асабліва Абама выступаюць за вывад войскаў, тады як Маккейн, які правёў доўгія гады ў палоне ў часе віетнамскай вайны, хоча вайны да пераможнага канца, «нават калі давядзецца застацца ў Іраку на сто гадоў». «Ніколі не здавацца» — вось слоган ягонай кампаніі. Амэрыканцам такая рыторыка даспадобы.

**Мікола Бугай, Спрынгфілд (штат Ілінойс, ЗША)**

# Ад сябра сябру

Беларусь можа атрымаць ад Вэнэсуэлы вялікі грашовы крэдыт. Ужо ў лютым.

«Спадзяюся, што пытаньне крэдыту для Беларусі будзе вырашанае яшчэ ў лютым — заявіў часовы паверэны ў справах Вэнэсуэлы ў Беларусі Амэрыка Дыяс Нуньес. — Цяпер гэтае пытаньне разглядаецца. Канкрэтную суму назваць не магу, але гаворка ідзе пра дастаткова вялікія грошы».

Магчыма, пытаньне крэдыту будзе вырашанае падчас візыту ў Каракас у сярэдзіне лютага беларускай урадавай дэлегацыі на чале зь дзяржсакратаром Рады Бясьпекі Віктарам Шэйманам. Падчас візыту будзе ўдакладнена праграма прыезду Уга Чавэса ў Беларусь. Хутчэй за ўсё лідэр Вэнэсуэлы наведае Менск пры канцы лютага ці ў пачатку сакавіка. Гэта ўжо будзе трэці візыт Чавэса ў нашу краіну.

Між нашымі краінамі актыўна вядзецца супрацоўніцтва па нафтаздабычы. Штодня беларусы здабываюць у Вэнэсуэле 5 тысяч барэляў «лёгкай» нафты. Цяпер ідзе гаворка пра канцэсію Беларусі яшчэ некалькіх радовішчаў у басэйне ракі Арынока.

Беларусь ня цалкам валодае гэтымі сьвідравінамі. Прыбыткі дзеляцца пароўну між нашай дзяржавай і Баліварыянскай рэспублікай.

Цікавы момант, што Беларусі выдзелілі старыя сьвідравіны, якія эксплюатуюцца ўжо больш за пяцьдзясят гадоў. Аднак вэнэсуэльскі дыплямат запэўніў, што нафты ў іх яшчэ дастаткова.

Ня выключана, што ўжо сёлета ў Беларусь паступіць першая, дваццацітонная, партыя вэнэсуэльскай кавы. Беларусы ж у Баліварыянскую рэспубліку, апроч трактароў і будаўнічых матэрыялаў, будуць пастаўляць сухое малако.

Дыплямат адзначыў, што вядзецца праца ў кірунку адмены візаў для беларускіх грамадзян, якія наведваюць Вэнэсуэлу, хацеў бы сп.Нуньес бачыць і просты авіярэйс між Менскам і Каракасам.

**Зьміцер Панкавец**



**Такія вось вэнэсуэльскія паштоўкі раздавалі падчас прэс-канфэрэнцыі.**

# Арыштаваны зяць Ломаця?

Апошні тыдзень хадзілі ўпартыя чуткі пра арышт кіраўніка Камітэту дзяржкантролю Зянона Ломаця. Іх не спыніў нават удзел сп. Ломаця ў студзеньскім пасяджэньні калегіі КДК. У пятніцу Ломаць узяў удзел у сумесным пасяджэньні КДК і Падліковай палаты Расеі. Якая ж крыніца гэтых чутак адносна чыноўніка, які летась стаў ледзьве не асабістым ворагам Камітэту дзяржаўнай бясьпекі? Іх маглі спарадзіць іншыя чуткі — пра тое, што пад арышт трапіў зяць Ломаця, якога абвінавацілі ў махінацыях з крэдытамі. Праўдай яны акажуцца ці не, ці яны адлюстроўваюць толькі нечыя «высока пастаўленыя» прагненьні, яны даносяць да нас гул вялікае таўкатні вакол дзяржаўнай уласнасьці.

**ЗП**

## Пад польскім консульствам у Менску зьніклі чэргі

У пачатку гэтага году ў чэргах па візы каля польскага консульства ў Менску стаяла больш за тысячу чалавек. Тыя, хто хацеў атрымаць візу й выехаць у Польшчу, мусілі запісвацца ў адмысловыя сьпісы, прыходзіць штодня на пераклічку. Цяпер сытуацыя кардынальна зьмянілася. Апошні тыдзень каля польскага консульства ніякіх чэргаў няма. Прычына — складаная працэдура афармленьня дакумэнтаў. Найбольш цяжка грамадзянам пацьвердзіць гатэль. Гэта абавязковая ўмова, калі хочаш атрымаць візу. Здаралася й такое, што гатэль аплачвалі наперад, рабілі пацьверджаньне, а консульства адмаўляла ў візе.

**ЗП**

# Дзень Волі 2008: Ад плошчы Якуба Коласа да опэры

6 лютага намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч падаў заяўку ў Менгарвыканкам на правядзеньне вулічнай акцыі на Дзень Волі.

Сябры аргкамітэту выпрацавалі наступны маршрут: збор 25 сакавіка а 18:00 на плошчы Якуба Коласа, шэсьце па праспэкце Незалежнасьці, вуліцах Валадарскага, Гарадзкі Вал,



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

канчатковым пунктам мусіць стаць помнік Максіму Багдановічу, што ля опэры. Цягам акцыі арганізатары плянуюць ускласьці кветкі да помнікаў Якубу Коласу, Янку Купалу, Адаму Міцкевічу і Максіму Багдановічу. Заяўнікамі вулічнай акцыі выступілі Аляксандар Мілінкевіч, Лявон Баршчэўскі, Анатоль Лябедзька і Мікола Статкевіч.

**Зьміцер Панкавец**

# Velcom: 360 мільёнаў на вецер

Інтрыга, зьвязаная з продажам «Мабільнай лічбавай сувязі» атрымала нечаканы працяг. Зьявіліся зьвесткі Нацбанку, зыходзячы зь якіх можна падлічыць суму дамовы.

Нагадаем, што ў жніўні 2007 г. беларуская дзяржава без правядзеньня тэндэру прадала сваю долю (51 %) у прадпрыемстве «Мабільная лічбавая сувязь» іншаму яе заснавальніку, кампаніі SB-Telecom. Сума дамовы не называлася.

Галоўная інтрыга зьявілася ў кастрычніку, калі кіпрскі SB-Telecom цалкам перайшоў ва ўласнасьць Telekom Austria Group за суму 1,05 млрд эўра. Узьнікла падазрэньне, што на апэрацыі Беларусь згубіла ад 200 да 400 млн даляраў ЗША, як зазначыў А.Мілінкевіч у адмысловай заяве.

На мінулым тыдні Нацбанк даў магчымасьць усім цікаўным упэўніцца ў слушнасьці такой ацэнкі, надрукаваўшы плацёжны баланс Беларусі за III квартал 2007 г. Аднак, адразу ж зьявіліся розныя вэрсіі наконт велічыні сумы, атрыманай ад продажу акцыяў. Так, «Агенцтва фінансавых навінаў» паведаміла, што дзяржаўная доля МЛС была прададзеная за 344 млн даляраў, а «Беларускія навіны» далі іншую лічбу — 290 млн даляраў. Ебытаніна ўзьнікла таксама і з тым, што журналісты паблыталі суб'ектаў зносінаў — Беларусь і ўрад Беларусі.

Зьвярнуўшыся да плацёжнага балянсу, мы ўбачым, што за першыя тры кварталы 2007 г. у Беларусь паступіла 1058,7 млн даляраў наўпроставых замежных інвэстыцыяў у форме акцыянэрнага капіталу. Сума, атрыманая ад продажу акцыяў Velcom у дакумэнце не пазначаная. Аднак, ведаючы суму дамовы па продажы 12,5 % акцыяў «Белтрансгазу» (625 млн даляраў), а таксама памер іншых паступленьняў (183,7 млн даляраў), лёгка знайсьці розьніцу, якая складае роўна 250 млн даляраў. Менавіта столькі было атрымана за акцыі мабільнага апэратара. І тут большасьць журналістаў дапусьціла памылку, палічыўшы, што гэтыя сродкі паступілі за ўвесь дзяржаўны пакет акцыяў. Насамрэч, у тэксьце згаданага дакумэнту ясна пазначана, што сродкі паступілі ад продажу «долі ўраду Рэспублікі Беларусь». Яна складала ў статутным фондзе МЛС толькі 30,9 %, у той час як 20 % належалі ЗАТ «Белтэхэкспарт», а 0,1 % — РУП «Белтэлекам». У плацёжным балянсе адлюстравана толькі тое, што ў бюджэт паступілі 250 млн даляраў менавіта за тыя 30,9 %. Дзе грошы ад продажу астатніх 20,1 % — сказаць цяжка. Мо яны паступілі ў бюджэт у IV квартале ці паступяць сёлета.

Простая арытмэтыка паказвае, што доля дзяржавы (ня ўраду!) у МЛС была прададзеная не за 290 і не 344 млн даляраў, а за 412,6 млн. Агульная сума дамовы па перапродажы Velcom афшорнай кіпрскай кампаніяй аўстрыйцам склала каля аднаго з паловай мільярда даляраў. Такім чынам, беларускія ўлады недаацанілі дзяржаўную долю прыкладна на 360 млн даляраў. Акурат такую лічбу, дарэчы, дае аналітычная служба «Руху «За Свабоду», камэнтуючы зьяўленьне новых статыстычных зьвестак.

**Дамінік Міхайловіч**

## ЭБРР прагназуе замаруджваньне і інфляцыю ў Беларусі

Эўрапейскі банк рэканструкцыі і разьвіцьця прагназуе замаруджваньне тэмпаў эканамічнага росту ў Беларусі да 6,5—7% і рост інфляцыі да 13%. Між тым, урад Беларусі пляную павялічыць ВУП на 11%, інфляцыю мяркуецца ўтрымліваць у межах 6—8%. У 2007 г. ВУП Беларусі павялічыўся на 8,2%, інфляцыя склала 12,1% (гэта афіцыйныя зьвесткі).

Разам з тым, вядучы эканаміст ЭБРР Аляксандар Пляханаў адзначыў, што ў цэлым беларуская эканоміка вытрымала энэргетычны шок на пачатку мінулага году. Аднак нечаканым стаўся рост інфляцыі напрыканцы году. На ягоную думку, тэндэнцыя гэтая захаваецца цягам гэтага году.

Акрамя таго, экспэрт адзначыў павышэньне кошту замежных пазыкаў, што можа нэгатыўна адгукнуцца на тэмпах эканамічнага росту краіны.

**СП, паводле bsb.by**

## СЬЦІСЛА

### Інфляцыя — 0,8 % за тры тыдні

Інфляцыя за тры тыдні студзеня склала 0,8%, паведаміў міністар эканомікі М.Зайчанка. Зь яго словаў, гэта абумоўлена ростам тарыфаў на паслугі ЖКГ. Гадавы прагноз інфляцыі складае 6—8 %. Паводле яго, за тры тыдні інфляцыя мусіла б вырасьці толькі на 0,4 %.

### Рост мінімалкі

Са студзеня мінімальная зарплата складзе 208 800 рублёў. Рашэньне прынятае пастановай Саўміну нумар 111. Пагадзінная мінімальная зарплата ўстаноўленая ў памеры Br1240.

### Радовішчы гіпсу, жалезных рудаў перадаюцца ў канцэсію

А.Лукашэнка зацьвердзіў пералік аб'ектаў, для перадачы ў канцэсію. Вызначаныя радовішчы гіпсу «Брынёўскае», жалезных рудаў «Аколаўскае» і «Навасёлкаўскае», бэнтанітавых глінаў «Астражанскае». Гэта стварае магчымасьць прыцягнуць замежныя інвэстыцыі для асваеньня гэтых багацьцяў. Канцэсія — гэта прыватна-дзяржаўнае партнэрства. Прыватная асоба або арганізацыя, укладаючы сродкі ў праект па канцэсійнай дамове, атрымлівае аб'ект дамовы ў кіраваньне і большую частку прыбытку. Дзяржава гарантуе захаванасьць укладзенага капіталу.

### Адчыніўся «Эўрабанк»

Праўленьне Нацбанку зарэгістравала прыватны банк. Заснавальнікам «Эўрабанку» зьяўляецца ТАА «Гандлёвы дом «Ждановічы». Статутны фонд новага банку адпавядае нарматыўнаму мінімальнаму памеру — больш як 5 млн эўра.

### Бізнэс у малых гарадах прастымулююць

Камэрцыйныя арганізацыі, утвораныя з 1 красавіка 2008 г. у гарадах з насельніцтвам да 50 тысяч чалавек цягам пяці год будуць вызваленыя ад падатку на прыбытак і шэрагу іншых падаткаў і збораў, сьведчыць дэкрэт №1 «Аб стымуляваньні вытворчасьці і рэалізацыі тавараў (работаў, паслуг)», прыняты 28 студзеня. Падатак на дададуню вартасьць застаецца.

Галоўная ўмова атрыманьня прэфэрэнцый — дзейнасьць менавіта ў тых гарадах і знаходжаньне там асноўных сродкаў прадпрыемства.

Адным зь мінусаў новага дэкрэту зьяўляюцца меры адказнасьці — неабходнасьць сплаціць падаткі і зборы за пэрыяд, калі прадпрыемства было вызваленае ад іх выплаты.

**Сямён Печанко, паводле «Беларусы и рынок»**

# Асаблівасьці сочынскіх трасаў, або Трое на аднаго

Чуткі спраўдзіліся: Лукашэнка і Пуцін сустрэліся ў Сочы. Дакладней, расклад быў «трое на аднаго». Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

**Працяг са старонкі 2.**

Між тым, Беларусь па-ранейшаму трывала сядзіць на іголцы нафтагазавай залежнасьці (мэнзурка «чорнага золата» з даліны Арынока можа разглядацца хіба што як музэйная каштоўнасьць). Калі замову на АЭС аддадуць расейскаму «Атомстройэкспорту», то энэргетычная (а значыць, і палітычная) залежнасьць ад Масквы толькі ўзмоцніцца. І тады наступнік Пуціна Мядзьведзеў элемэнтарна даб’е «беларускае пытаньне» паводле даўно напісанага ў Крамлі сцэнару.

Дарэчы, гэтым разам у Сочы Лукашэнка меў гутарку зь Мядзьведзевым аж двойчы. Спачатку, нібыта між іншага сутыкнуўшыся ў гарналыжным цэнтры, яны абмеркавалі, як прагучала па НТВ, «асаблівасьці сочынскіх трасаў». А потым гэтак сама «між іншага» будучы гаспадар Крамлю зазірнуў на агеньчык у «Бачароў ручай», дзе вялі гутарку два дзейныя прэзыдэнты. Звыш таго, завітаў і прэм’ер Зубкоў. Як дасьціпна зазначыў аглядальнік Аляксандар Зайцаў, «трое на аднаго, канечне, несумленна, але, можна меркаваць, вельмі эфэктыўна».

На думку расейскага палітоляга Андрэя Суздальцава, «перад Лукашэнкам было пастаўленае пытаньне — з кім ён? Альбо ён далей разьвівае інтэграцыйны праект, альбо ён займаецца сваёй дзяржавай і ніякіх адносінаў да Расеі ня мае. Сытуацыя павінна быць вырашаная, тым больш напярэдадні прыходу да ўлады новай эліты».

Для прэсы ж Пуцін на той сустрэчы гучна парадаваўся нябачанаму двухбаковаму таваразвароту — 25 мільярдаў даляраў (калі больш дакладна, то нават 26 з гакам). Нам жа тут хутчэй плакаць варта, бо менавіта ў гандлі з Расеяй маем катастрафічнае адмоўнае сальда — аж 8,3 мільярда! Лукашэнка ў гэтым кантэксьце стрымана зазначыў, што нам яшчэ «трохі пашэнціла, цэны на харчаваньне падскочылі». Маўляў, нашыя сельгасвытворцы на гэтым падзарабілі. Зноў жа невядома, радавацца ці плакаць, бо родны ўрад пад маркай выраўноўваньня прадуктовых цэнаў з суседзкімі борзьдзенька ўздымае цэны на харчы ў нашых крамах.

Яшчэ з канкрэтыкі: беларускі кіраўнік сьціпла папрасіў, каб нашым адмыслоўцам далі магчымасьць пабудаваць у тых мясьцінах хоць адзін з 70 алімпійскіх аб’ектаў. Маўляў, створым тут вам «куток Беларусі».

Што ж, зарабіць на выгаднай будоўлі не зашкодзіць. Адно што точыць трывога: каб да той Алімпіяды з самой Беларусі не зрабілі «куток Расеі».

**ЛЕВЫМ ВОКАМ**

# Сабачы дзень у Сочы

Цікава было б, каб пра гістарычную сустрэчу новага расейскага і вечнага беларускага лідэраў распавёў сабака Пуціна лабрадор Коні. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Ну і дзянёк выдаўся! Зранку ўстаў, пашукаў блох. Пайшоў у кабінэт да гаспадара. Той ходзіць па пакоі, бурчыць: блін, кажа, трэба было ўсё ж рэфэрэндум, як бацька, забацаць пра трэці тэрмін. Цяпер бы сядзеў у цяпле ў Крамлі, глядзеў бы Галкіна па целеку, а не займаўся б фігнёй нейкай».

Пабачыў мяне — павёў на прагулку. Задавальняю, значыць, я каля браніраванага мэрса малую патрэбу і раптам бачу — нешта зашмат ахоўнікаў на дачы. Ну, думаю — накрылася гульня ў мячык: госьць прыедзе. Пачнецца важданіна: будуць мяне часаць за вухам і гладзіць па сьпіне, каб спадабацца гаспадару. Дурні! Быццам я ўвечары прыйду да яго ў спальню і скажу: «Слыш, Уладзіміравіч, а давай Януковічу цэны на газ скінем. Ён такі мілы, — так файна за вухам чэша...

Добра, крыху адышоў ад тэмы. Значыцца, тут машына ў двор едзе: адтуль нейкі вусач. Я пазнаў яго. Ён тут у нас часта круціцца. Усё залівае пра славянскае сяброўства. «У нас, кажа, хутка будзе такое славянскае сяброўства. Такое славянскае сяброўства, што закачаесься». Я так і не зразумеў, пра што гэта ён. Ніколі не было такога, каб гаспадар сказаў жонцы: мне тут «славянскае сяброўства», нарэшце, прывезьлі, схавайце яго, каб дочкі выпадкова не зламалі або сабака не пагрыз.

Гаспадар кажа: «Пойдзем па спартовых аб’ектах». Селі ў машыну і паехалі.

Выйшлі ў гарах. Поўная жэсьць. Адзін сьнег. Ні сучак, ні жратвы, ні мячыка. А там ужо двое тусуюцца з лыжамі. Адзін — малады і песчаны. Другі — стары, на мянушку Зубкоў адклікаецца. Гаспадар кажа вусатаму: «А гэта мой пераемнік».

Той узрадаваўся. Пачаў маладому казаць пра славянскае сяброўства. Малады афігеў, адзінае, што можа сказаць: «Тэхніку закупаем. Яна па якасьці добрая, ды і цана канкурэнтаздольная». І ўвесь час на гаспадара глядзіць, быццам баіцца лішняга ляпнуць.

Нарэшце вярнуліся на дачу.

Селі ўтрох. Малады, вусаты і гаспадар.

— Хочам тут на Алімпіядзе беларускі куток замуціць, — кажа вусаты.

Малады: «Тэхніку закупаем. Яна па якасьці добрая, ды і цана канкурэнтаздольная».

У мяне поўсьць натапырылася. Гэта ж ён тут будзе ўсю Алімпіяду, амаль месяц, тырчаць! Накрылася медным тазікам гульня ў мячык. Давядзецца з ранку да вечара пра славянскае сяброўства слухаць.

Нарэшце скончылі.

Зранку гаспадар чытаў услых газэты. Паслухай, кажа, Коні, што піша «Саўбелка»: стасункі адбыліся і, са словаў журналістаў-відавочцаў, былі вельмі цёплымі. Па сутнасьці, гэта першая такая сустрэча — вочы ў вочы...

Ржу — не магу. Якое можа быць цяпло ў гарах?

# Асобы студзеня

Хто варты званьня асобы першага месяца году? Хто зрабіў найбольш у гэтым месяцы і тым самым прыцягнуў да сябе ўвагу грамадзкасьці і мэдыяў?



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Прадпрымальнікі.** Дробныя гандляры працягваюць змагацца за адмену прэзыдэнцкага ўказу № 760. Год пачаўся зь іх 15-дзённай забастоўкі. Паводле словаў аднаго зь лідэраў прадпрымальніцкага руху Алеся Таўстыкі, у Менску на шэрагу рынкаў страйкавалі да 90 % гандляроў. У студзені дробныя гандляры правялі дзьве вулічныя акцыі пратэсту. 10 студзеня маніфэстанты спрабавалі прайсьці да Адміністрацыі прэзыдэнта, а пасьля рушылі праспэктам, урэшце перакрыўшы рух на плошчы Незалежнасьці. Колькасьць пратэстоўцаў дасягнула пяці тысяч. Пасьля акцыі больш за два дзясяткі чалавек апынуліся за кратамі, а пракуратура завяла крымінальную справу. На сутках на Акрэсьціна апынуліся амаль усе лідэры руху: Алесь Таўстыка, Алесь Макаеў, Анатоль Шумчанка, Сяргей Парсюкевіч, Уладзімер Шыла. Нягледзячы на прэвэнтыўныя арышты, каля дзьвюх тысяч дэманстрантаў узялі ўдзел у акцыі пратэсту ў цэнтры Менску 21 студзеня. Разгонам асабіста камандаваў міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў. Прадпрымальнікі зьбіраюцца і надалей адстойваць свае правы. Яны распачалі лютаўскі страйк, а наступная вулічная акцыя прызначаная на 18 лютага.



KP.BY

**Алесь Марачкін.** Увесну 2007 г. ужо былы галоўны ідэоляг краіны Алег Праляскоўскі запатрабаваў ад Міністэрства адукацыі выключыць з школьнай праграмы «пісьменьнікаў-нацыяналістаў» — Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна ды інш. Таксама Праляскоўскі патрабаваў «выключыць зь ілюстрацыйных матэрыялаў творы мастака А.Марачкіна». Як высьветлілася, зь некаторых кніг выключылі ня толькі творы Марачкіна, але і яго самога. У кнізе «Мікола Селяшчук. Гучаньне музыкі нябёсаў» з групавога фатаздымку мастакоў «зьнік» Алесь Марачкін. «У 1937-м зьнікненьне пэўнай асобы з партрэту ці здымку магло б азначаць, што яе расстралялі», — кажа мастак. Марачкін ня стаў замоўчваць выпадак з цэнзурай. Але творца не зьбіраецца падаваць у суд на складальнікаў кніжкі, ён проста хоча паразмаўляць з гэтымі людзьмі, каб даведацца пра іхныя матывы.

**Зьміцер Жалезьнічэнка.** Моладзевага актывіста з Гомелю Зьмітра Жалезьнічэнку 25 студзеня адправілі на тэрміновую службу ў Жлобін у чыгуначныя войскі (в/ч — 83469). За тры дні да гэтага яго адлічылі з Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Ф. Скарыны. Пратэстуючы супраць незаконнага адлічэньня з ВНУ і гвалтоўнай адпраўкі ў войска, хлопец некалькі дзён трымаў галадоўку. Адным зь ягоных патрабаваньняў зьяўляецца тое, каб усе загады яму аддавалі на беларускай мове. Прыклад Жалезьнічэнкі пераняў Юрась Алейнік, які таксама патрабуе беларускамоўнай службы.

**Руслан Аляхно.** У траўні Беларусь на музычным конкурсе «Эўрабачаньне» ў Бялградзе (Сэрбія) прадставіць Руслан Аляхно. На фінале адборачнага конкурсу ў Менску Аляхно апярэдзіў гурты Litesound, «По глазам», сьпявачку Гюнэш.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Браты **Андрэй і Сяргей Касьціцыны.** Наваполацкія хакеісты Андрэй і Сяргей Касьціцыны на сёньняшні дзень вызначаюць гульню найлепшага клюбу НХЛ усіх часоў — «Манрэаль Канадыенс». Андрэй, побач з расейцам Андрэем Кавалёвым, фі-



нам Саку Койву і чэхам Томашам Плеканцам, стаў лідэрам атак 24-разовага ўладальніка Кубку Стэнлі. Сяргей у свае 20 гадоў замацаваўся ў асноўным складзе каманды. Браты Касьціцыны адразу сталі улюбёнцамі тамтэйшых фанатаў. На сёньняшні дзень «Манрэаль» займае выніковае (па балах) другое месца ва Ўсходняй канфэрэнцыі. Браты ж цягам месяца выдалі некалькі фантастычных матчаў. Напрыклад, з «Бостанам» і «Вашынгтонам».

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Хто, па-вашаму, можа лічыцца чалавекам студзеня?**

| | |
|---|---|
| Руслан Аляхно | 24 (5%) |
| Зьміцер Жалезьнічэнка | 223 (46%) |
| браты Касьціцыны | 24 (5%) |
| Алесь Марачкін | 19 (4%) |
| прадпрымальнікі | 194 (40%) |

Усяго прагаласавала па стане на аўторак: 484

### 30 студзеня

#### «Новае Жыцьцё» пад агнём

Япіскап Аб'яднаньня хрысьціянаў поўнага Эвангельля **Вячаслаў Ганчарэнка** заявіў, што цягам апошніх некалькіх месяцаў у царкву «Новае Жыцьцё» ўлады скіроўваюць розныя службы — тыя спрабуюць пранікнуць у будынак. Пракуратура Маскоўскага раёну Менску вынесла папярэджаньне пастару за тое, што ён адмовіўся ўпусьціць у будынак прадстаўнікоў МНС. Аднак агульны сход вернікаў пастанавіў прынцыпова не пускаць нікога, пакуль Менгарвыканкам не адменіць рашэньне адабраць у царквы зямлю.

#### «Новае Пакаленьне» таксама

Суд пакараў штрафам 700 000 рублёў царкву **«Новае Пакаленьне»** Саюзу хрысьціянаў поўнага Эвангельля. Царкву зьвінавацілі ў нямэтавым выкарыстаньні зямлі. У 1997 г. царква набыла будынак складу і пасьля рамонту, цягам дзесяці гадоў, праводзіла там багаслужбы. Улады зьвінавацілі царкву, што яна карысталася будынкам не па прызначэньні.

#### Вярхоўны Суд адмовіў хрысьціянскім дэмакратам

ВС не задаволіў скаргу да Міністэрства юстыцыі, якое не зарэгістравала сацыяльна-грамадзкае аб'яднаньне **«Беларуская хрысьціянская дэмакратыя»**. Паводле прадстаўніцы аргкамітэту **Насты Лойкі**, суд скасаваў тры зь пяці падставаў аб адмове ў рэгістрацыі, аднак скарга засталася незадаволенай. З яе словаў, прычыны, паводле якіх Мін'юст не рэгіструе грамадзкага аб'яднаньня, зьяўляюцца хутчэй юрыдычнымі зачэпкамі. Першая — у мэтадах дзеяньня пазначана «грамадзкая экспэртыза», але ВС лічыць, што аб'яднаньне ня мае права праводзіць такую экспэртызу. Другая — тэхнічная памылка ў расейскамоўным варыянце статуту. Рашэньне вынесла судзьдзя **Галіна Жукоўская**.

### 31 студзеня

#### За сьцяг

Віцебскіх актывістаў **Барыса Хамайду** і **Аляксандра Салаўяна** затрымалі 29 студзеня на вуліцы Церашковай. Іх зьвінавацілі ў правядзеньні несанкцыянаванага пікету з вывешваньнем бел-чырвона-белага сьцяга. На загад начальніка Кастрычніцкага РУУС **Андрэя Пракаповіча** да суду затрыманых зьмясьцілі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. У сераду суд перанесьлі, бо А.Салаўян запатрабаваў забясьпечыць яму перакладчыка. Яго падтрымаў і Б.Хамайда. У чацьвер сп.Салаўян адмовіўся адказваць на пытаньні **судзьдзі Ірыны Смаляковай**. Б.Хамайда на пытаньні адказваў, ён не хаваў таго, што вывешваў на вуліцы сьцяг. У выніку паводле арт. 23.24 КаАП апазыцыянэраў зьвінавацілі ў арганізацыі і правядзеньні несанкцыянаванага мерапрыемства. Б.Хамайда атрымаў 13 сутак, А.Салаўян — 12.




**Такую расьцяжку вывесілі 2 лютага, на дзень народзінаў Каліноўскага, асіповіцкія актывісты Моладзі БНФ.**

### 1 лютага

#### Зарамбюк вінен дзяржаве паўмільёна

Гарадзенскі абласны суд адхіліў скаргу актывіста «Руху «За Свабоду» **Алеся Зарамбюка** і пакінуў бязь зьменаў пастанову суду Мастоўскага раёну ад 29 сьнежня 2007 г. Судзьдзя **А.Козел** спаслаўся на сьведчаньні супрацоўнікаў Мастоўскага РУУС **В.Трубенкі**, **Е.Самошкіна**, **А.Данільчыка**, а таксама рапарт участковага інспэктара **І.Вінаграда**.

А.Зарамбюк быў асуджаны судом Мастоўскага раёну да выплаты штрафу памерам 15 базавых адзінак (525 тысяч рублёў) «за парушэньне ўстаноўленага парадку правядзеньня сходаў». Актывіста зьвінавацілі ў арганізацыі сустрэчы Аляксандра Мілінкевіча з жыхарамі Мастоў.

Цяпер Зарамбюк рыхтуе скаргу ў Вярхоўны Суд.

### 2 лютага

#### Дашкевіч і Шыла невыязныя

Памежнікі ня выпусьцілі зь Беларусі лідэра незарэгістраванага «Маладога фронту» **Зьмітра Дашкевіча**, а таксама сябра гэтай жа арганізацыі з Салігорску **Івана Шылу**. Дашкевіч ехаў у Літву па пытаньнях вучобы, Шыла — у якасьці турыста.

Нагадаем, што раней аб сваім невыязным статусе даведаліся яшчэ два маладафронтаўцы: **Яраслаў Грышчэня** з Баранавічаў і **Барыс Гарэцкі**. Апошні даведаўся прычыну адмовы: да суду не дайшоў штраф, які Барыс меўся сплаціць пасьля таго, як ён быў асуджаны за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.

### 4 лютага

#### І Лябедзька...

Лідэру Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) **Анатолю Лябедзьку** чарговы раз адмовілі ў выезьдзе за мяжу. На пагранічным пераходзе «Каменны Лог» палітыку паставілі ў пашпарце штамп з надпісам «У выезьдзе адмоўлена».

Такім чынам, А.Лябедзька ня змог выехаць у Літву, дзе 4 лютага ў яго быў заплянаваны шэраг сустрэч з дэпутатамі літоўскага Сойму.

**СП**

## Напішыце Андрэю Кіму

4 лютага створаны аргкамітэт грамадзкай камісіі «Свабоду Андрэю Кіму! Свабоду прадпрымальніцтву!» У камітэт увайшлі прадстаўнікі прадпрымальніцкага руху, палітыкі, сябры арыштаванага: **Мікалай Аўтуховіч**, **Вячаслаў Сіўчык**, **Аляксей Бондар**, **Павал Севярынец** ды іншыя. Падставай для стварэньня камітэту стаў націск на індывідуальных прадпрымальнікаў і ўдзельнікаў прадпрымальніцкіх пратэстаў, а найперш **Андрэя Кіма**, чый арышт ўдзельнікі аргкамітэту лічаць палітычным. Нагадаем, што на А.Кіма заведзеная крымінальная справа паводле арт. 364 КК («Гвалт, альбо пагроза гвалту ў адносінах да работніка міліцыі»). Нібыта ён у часе мітынгу прадпрымальнікаў 21 студзеня ўдарыў супрацоўніка ДАІ кулаком у твар і расьсек таму брыво да крыві. Яму пагражае да 6 гадоў турмы. Маці Андрэя кажа, што сьледчы пракуратуры пакуль не дазволіў ёй сустрэчу з сынам.

Аргкамітэт запрашае ўсіх неабыякавых пісаць лісты падтрымкі Андрэю, які цяпер знаходзіцца ў сьледчым ізалятары, на адрас:

220050, Менск, СІЗА-1, Андрэю Кіму.



# Закон dura. А мы?

Для нашага грамадзтва панятак свабоды слова, як і ўвогуле любой іншай свабоды, пакуль што мала што значыць. Піша **Віталь Тарас**.

Гісторыя з выдаленьнем выявы мастака Аляксея Марачкіна з фатаграфіі ў кнізе, выпушчанай нядаўна «Мастацкай літаратурай», выглядае адназначна. Думаецца, калі б такога выпадку ў Беларусі дагэтуль не было, начальству яго давялося б прыдумаць. Каб можна было потым ўключаць у якасьці ілюстрацыі для хрэстаматыі па гісторыі цэнзуры.

Заўважце — ніхто з тых, хто меў дачыненьне да выданьня кнігі, не адпрэчвае самога факту. Кожны спрабуе давесьці толькі, што ня мае да яго ніякага дачыненьня. Не, каб высокае начальства заявіла: гэта зроблена ў інтарэсах дзяржавы! То бок, у імя яе інтарэсаў мы «выразалі» й будзем «выразаць» усіх, хто нам не падабаецца. Замест гэтага — маўчаньне.

Няма сёньня афіцыйных заступнікаў у цэнзуры.

Хаця, ня выключана, урэшце будзе заяўлена, што адбылася «тэхнічная памылка». І хаця таварыш Сталін казаў, што ў кожнай памылкі ёсьць імя й прозьвішча, у дадзеным выпадку, канечне, імёнаў ня будзе. Будзе як у савецкага сатырыка Райкіна: «Хто шыў гарнітур?» — «Мы!»

Прыкра толькі, што цень гучнага скандалу ўскосна ляжа ня толькі на дзяржаўнае выдавецтва, але й на кнігу, прысьвечаную сьветлай памяці Міколы Селешчука.

А вось выпадак са Зьдзьвіжковым, асуджаным за карыкатуры, многім падаецца не настолькі адназначным. Нават у камэнтарах на гэтую тэму ў «Нашай Ніве» нярэдка можна сустрэць такое меркаваньне: чалавека, мабыць, і шкада (хоць многія пішуць — мала далі), але закон ён парушыў, таму павінен сядзець у турме.

Так бы мовіць, dura lex sed lex. Закон суворы, але гэта закон.

Толькі чамусьці ён не зусім бывае суворы, калі размова тычыцца цэнзуры, забароненай Канстытуцыяй РБ. Можна цэнзураваць тэлевыступы апазыцыйных кандыдатаў на прэзыдэнцкіх выбарах (як у выпадку з Казуліным і Мілінкевічам). Пра «плямы ў газэтах» ужо і ўспамінаць цяпер сьмешна. Як і пра канстытуцыйнае права грамадзянаў на інфармацыю — у сьвятле афіцыйных дачыненьняў чыноўнікаў і журналістаў.

А ў выпадку з карыкатурамі закон спрацаваў, што называецца, амаль на поўную катушку.

## Правільна пасадзілі

Мне давялося нядаўна сустрэць у інтэрнэце такое меркаваньне (цытую блізка да тэксту): «Правільна зрабілі, што пасадзілі Зьдзьвіжкова, і няма чаго яго абараняць. Няма ніякай свабоды слова нідзе. Ёсьць маніпуляцыі з мэтай зарабіць на гэтым пункце. Так, газэта «Згода» проста хацела прыцягнуць да сябе ўвагу, друкуючы карыкатуры. А цяпер з дапамогай скандальнага працэсу нехта хацеў выклікаць міжнародны скандал, што яму (ім) удалося.»

Тут справа нават не ў адсутнасьці лёгікі — чаму ж дзяржава нарвалася на такі скандал, які наносіць шкоду яе рэпутацыі? Якія загадкавыя сілы прымусілі яе? (Адказ вядомы — канечне, жыдамасоны на чале з амэрыканскім урадам.)

Справа ў тым, што тут, як і ў многіх іншых камэнтарах, няма ні каліва ўсьведамленьня каштоўнасьці свабоды слова. Між іншага, заўважу, што ні гэты чалавек, ні многія іншыя ягоныя аднадумцы нават не паспрабавалі адшукаць у інтэрнэце дацкія карыкатуры на прарока Мухамэда (гэта зрабіць вельмі лёгка), каб займець уласнае меркаваньне пра ступень «экстрэмізму» тых малюнкаў. А навошта?

Падобныя «дыскутанты» зь лёгкасьцю падхаіпілі падкінутую ім думку, быццам выявы людзей забароненыя ісламам. Але дастаткова зайсьці ў інтэрнэт і пабачыць там, напрыклад, малюнак прарока Мухамэда, узяты з Карану XVII стагодзьдзя.

А мабыць, увогуле варта забараніць інтэрнэт, разам з усімі малюнкамі і тэкстамі, каб не было ніякага рэлігійнага экстрэмізму? І ніякіх іншых думак?

У тым і парадокс, што зацятыя праціўнікі свабоды слова ахвотна карыстаюцца ёй, друкуючы свае «опусы» і «думкі» ва ўсясьветным сеціве.

Хаця, чаго тут зьдзіўляцца? У 1917-м бальшавікі раздраконілі й забаранілі ўсе «варожыя тыпаграфіі» ў Расеі. А потым 70 гадоў трымалі манаполію на СМІ з дапамогай самай жорсткай цэнзуры. А калі ў 1991-м Ельцын спрабаваў зачыніць газэту «Праўда», камуністы ўзьнялі масавую гнеўную кампанію ў абарону свабоды друку. З таго часу ў Расеі няма большых абаронцаў свабоды, дэмакратыі й правоў чалавека, як камуністы.

Ёсьць свабода слова для сябе, на якую ніхто ня мае права замахвацца. І ёсьць свабода слова для іншых — яна выкарыстоўваецца выключна ў мэтах «спэкуляцыяў» і рознага роду махінацыяў.

## А ў вас нэграў лінчуюць...

Як правіла, процістаўляецца нашая «маладая дэмакратыя» (раней казалі — савецкая, потым у Крамлі вынайшлі яшчэ адзін тэрмін — «сувэрэнная») амэрыканскай. Амэрыка, ясная справа, краіна «падвойных стандартаў», «ілжэдэмакратыі» ды ўяўнай свабоды слова. Як у старым савецкім анэкдоце пра Кісынджэра й Грамыку: на ўсе абвінавачаньні міністар замежных справаў СССР адказваў: «А ў вас нэграў лінчуюць…»)

Для таго, каб адчуць розьніцу паміж стандартамі, якія пануюць у ЗША і ў Беларусі альбо ў Расеі, дастаткова параўнаць прэзыдэнцкія выбары там і тут. Колькі было безапэляцыйных заяваў і глыбокай іроніі расейскіх і беларускіх «палітолягаў» наконт кандыдатуры Маккейна: яму, маўляў, даўно трэба выйсьці ў тыраж, яму нічога ня сьвеціць, ніякіх шанцаў і г. д. Асабліва не спадабалася аўтарам «прагнозаў» фраза Маккейна, што ў вачах Пуціна ён прачытаў усяго тры літары: K.G.B. (Іранічны пэрыфраз вядомай фразы Буша пра тое, што ў вачах Пуціна ён убачыў душу.) Як жа

такі чалавек можна ўзначаліць ЗША?

З гэткай жа апэляцыйнасьцю даводзілася, што будучым прэзыдэнтам стане Хілары Клінтан. Але напярэдадні «супэр-пупэр-аўторка» 5 лютага ніхто з сур'ёзных амэрыканскіх палітаглядальнікаў ці сацыёлягаў не сьпяшаўся назваць яўных фаварытаў «праймэрыз» — ні ў рэспубліканцаў, ні ў дэмакратаў. Усё канчаткова можа вырашыцца толькі падчас іхных зьездаў. А пасьля — 4 лістапада 2008 году, у дзень выбараў. І нічога, такая няпэўнасьць, адсутнасьць «пераемніка» не адбіваецца на жыцьці краіны. Фінансавы крызіс мог бы адбыцца пры любым прэзыдэнту ЗША. А рашэньне зьнізіць падаткі для ўсіх амэрыканскіх прадпрымальнікаў яўна не стасуецца з практыкай «бізуна» ў вырашэньні эканамічных пытаньняў у Беларусі.

### Мара пра зьнікальнік

Відавочна, паўтаруся, што для беларускага грамадзтва панятак свабоды слова, як і ўвогуле любой іншай свабоды, пакуль што мала што значыць. Спадар Сіліцкі ў сваім нядаўнім артыкуле параўнаў грамадзтва РБ на сучасным этапе з гарэзьлівай дзяўчынай-падлеткам, патрэбы якой растуць і якая пачынае ўжо праз гэта ня слухацца таты. Вобраз прыгожы, але, як на маю думку, пакуль далёкі ад рэчаіснасьці. Калі ўжо карыстацца полаваўзроставымі катэгорыямі, дык нашае грамадзтва, хутчэй, нагадвае маленькае дзіця (гадоў гэтак 7—8), якому прыйшоў час раніцой уставаць, каб ісьці ў школу. Дарослыя спрабуюць яго раскатурхаць, але ён з усіх сілаў сьціскае павекі, удаючы, што моцна сьпіць.

У амэрыканскага фантаста Генры Катнэра ёсьць сэрыя апавяданьняў пра Гогбэнаў — радзіну мутантаў. Малодшы Гогбэн аднойчы вынайшаў цацку — чароўную прыладу , якую назваў «зьнікальнікам». Навядзеш такі зьнікальнік на чалавека, які табе не падабаецца, ці прадмет — і вось ён ужо зьнік бязь сьледу. Дзіцячая мара займець такі прыбор, відаць, захавалася ў душы шмат каго з дарослых. Асабліва сярод высокіх чыноўнікаў. Сапраўды — чым кепска: навёў прыбор на Марачкіна ці Зьдзьвіжкова, ці яшчэ на каго-небудзь, а іх ужо няма. А няма чалавека — няма праблемы, як вядома.

Хвароба інфантылізму для грамадзтва небясьпечная, бо лякуецца выключна радыкальнымі сродкамі. Якія могуць быць яшчэ горшымі за хваробу. Ніводнаму нармальнаму чалавеку не хацелася б для сваёй краіны рэвалюцыі ці хаця б эканамічнага і палітычнага крызісу. А яны рана ці позна становяцца непазьбежнымі, калі не глядзець на сьвет шырока расплюшчанымі вачыма. (Eyes Wide Shut — гэта хай застаецца ў гісторыі кіно.)

Ясна, што грамадзтву ў цэлым цяжка гэта ўсьвядоміць. Ну, а што ж нашая інтэлектуальная эліта — пісьменьнікі, мастакі, навукоўцы? Гэта ўжо зусім іншая гісторыя... Але, выглядае, ня менш сумная.

# Гэта еднасьць

**Аляксандар Шрамко** заклікае праваслаўных і каталікоў устаць на абарону царквы «Новае Жыцьцё».

Дрэнна, калі няма салідарнасьці паміж хрысьціянамі. Але яшчэ горш, калі салідарнасьць падмяняецца яе падробкай. Símнават ня проста падмяняецца, а гэтая падмена выкарыстоўваецца як шырма, каб адвесьці ўвагу ад рэчаў якраз супрацьлеглых братэрству і любові.

Гэтымі днямі нешта дзіўнае мы назіраем у Беларусі.

Не адзін год вернікі пратэстанцкай царквы «Новае Жыцьцё» змагаюцца за самае простае права — права маліцца ў сваім жа, набытым для гэтай мэты, будынку.

Апошні час ціск на царкву з боку ўлады павялічыўся. Пастару проста пагражаюць арыштам. Вось тут было б добра паказаць еднасьць хрысьціянам розных канфэсій. Улады ніколі б не пайшлі супраць усіх. Яны ідуць супраць адной царквы, бо ведаюць — яе можна прыдушыць, а іншыя нават не заўважаць ці зробяць выгляд, што не заўважылі. Яны будуць гуляцца ў «еднасьць» у сваіх «правільных» саборах. Маўляў, бачыце, якая ў нас талерантнасьць у краіне, дзе хрысьціянскія канфэсіі паважаюць і любяць адна адну.

Вось чамусьці толькі тыя, якія дазваляе паважаць і любіць улада.

Перад усім сьветам прыкрыем са сьвечкамі беззаконьне, якое не дазваляе людзям верыць і маліцца ў адпаведнасьці з сумленьнем.



Экумэнічная малітва прадстаўнікоў розных канфэсій.

## Кветкі для Касьцюшкі ў Вашынгтоне

4 лютага, у дзень нараджэньня Тадэвуша Касьцюшкі, прадстаўнікі беларускай дыяспары ўсклалі кветкі да ягонага помніка ў цэнтры Вашынгтону.

Большасьць беларусаў ведаюць Касьцюшку як арганізатара паўстаньня за аднаўленьне незалежнасьці Рэчы Паспалітай. Але за акіянам ён болей вядомы як герой вайны за незалежнасьць ЗША. Касьцюшка далучыўся да войска ЗША як добраахвотнік і даслужыўся да званьня брыгаднага генэрала інжынэрыі.

Існуе гісторыя, што пасьля таго, як Касьцюшка прачытаў Дэклярацыю пра незалежнасьць ЗША, ён быў настолькі ўзрушаны тымі правамі і свабодамі, што ў ёй гарантаваліся, што вырашыў сустрэцца зь яе асноўным аўтарам — Томасам Джэфэрсанам. Яны сталі блізкімі сябрамі. А пазьней Джэфэрсан, трэці прэзыдэнт ЗША, назваў Касьцюшку «самым сапраўдным сынам свабоды, якога ён калісьці ведаў».

Касьцюшка атрымаў грамадзянства, зямлю, а таксама буйную суму грошай ад амэрыканскага ўраду. Але нягледзячы на пашану і выгоды, Касьцюшка вырашыў вярнуцца ў Эўропу. Праз дзесяць гадоў пасьля вяртаньня з Амэрыкі ён падняў паўстаньне за свабоду і незалежнасьць сваёй Бацькаўшчыны.

Шматлікія масты, вуліцы і нават выспы ў ЗША названыя ў гонар Касьцюшкі. Помнік яму стаіць і ў парку Ляфает насупраць Белага Дому ў Вашынгтоне. 4 лютага каля гэтага помніка зьявіліся белыя і чырвоныя тульпаны.

**Яраслаў Крывой, Вашынгтон**

## Польшча ўводзіць аблегчаны рэжым для беларусаў-гастарбайтэраў

З 1 лютага беларусы, расейцы, украінцы атрымаюць магчымасьць працаваць у Польшчы безь перапынку шэсьць месяцаў. Раней яны мусілі кожныя тры месяцы выяжджаць дахаты, маючы магчымасьць вярнуцца не раней, чым па сканчэньні трох месяцаў.

## Расейцы не прапусьцілі беларускае мяса

Супрацоўнікамі ўпраўленьня сельгаснадгляду па Смаленскай вобласьці прыпынены ўвоз у Расею зь Беларусі 9 т ялавічыны.

Мяса было ў машыне, якая не прадугледжвае перавозку мясной сыравіны без вэтэрынарных дакумэнтаў.

## Электрычка Гомель—Вільня

Сёлета пачнецца электрыфікацыя каляі Асіповічы — Жлобін. Пасьля будзе электрыфікаваны ўчастак Жлобін — Гомель. Электрычная цяга каштуе на 30 % таньней за дызпаліва. Зьменшаюцца выдаткі на перавозкі грузаў, паляпшаец-ца экалягічная сытуацыя. У пэрспэктыве электрыфіка-цыю павядуць і ў кірунку Маладэчна—Гудагай—Вільня. Чыгунка Літвы прапануе пачаць у 2010 г., беларусы гатовыя раней.

## Хто яшчэ бяз флікера?

5—11 лютага ў Менску праходзіць апэрацыя «Пешаход». Штодня ў сталіцы да адміністрацыйнай адказнасьці прыцягваюцца каля 180 пешаходаў, якія пераходзяць дарогу ў забароненых месцах альбо на чырвонае сьвятло. Каля 60 такіх парушальнікаў не карыстаюцца па цемначы сьвятлістымі элемэнтамі.

## Цырк пераедзе да Нацбібліятэкі

З 1 красавіка будынак сталічнага цырку зачыніцца на рэканструкцыю. Артысты часова пераедуць у шапіто. Пад яго пабудову вылучаная пляцоўка ля Нацыянальнай бібліятэкі. Шапіто зможа зьмясьціць каля дзьвюх тысяч гледачоў. Плянуецца, што работы па рэканструкцыі цыркавога будынку выканаюць за год.

## Пац і мыш на 1000 м кв

Шчыльнасць засяленьня Менску грызунамі не перавышае двух асобінаў на тысячу кв м. Большая частка заселенай грызунамі плошчы прыходзілася на жылыя дамы (61,4 %) і прамысловыя прадпрыемствы (13,9 %). У жылых дамах, заселеных грызунамі, доля пацукоў складае 85,2 %, мышэй — 14,8 %, на прамысловых прадпрыемствах адпаведна 73,8 % і 26,2 %. На аб’ектах харчовага гандлю, грамадзкага харчаваньня, у інтэрнатах пераважаюць мышы.

## У Беларусь пераселяць ланяў

60 асобін плянуецца прывезьці ў астравецкія лясы з Балтыі. Грошы, а гэта тысяча эўра за адну жывёліну, ужо праплачаныя. Сродкі атрыманыя па дзяржаўнай праграме разьвіцьця паляўнічых гаспадарак. Лані дагэтуль не вадзіліся ў нашых лясах.

**Паводле БелаПАН, «Мінск-навіны», БЕЛТА, «Вечерний Гродно»**


**Вячаслаў Кебіч выдаў мэмуары. У кнізе былога прэм’ер-міністра «Спакушэньне ўладай» апісваюцца падзеі ад апошніх гадоў Савецкага Саюзу да нашых дзён.**

PHOTO.BYMEDIA.NET



## Такое вось «адраджэньне» вёскі Сасноўка

**Адзін за адным пачынаюць пусьцець домікі ля вёскі Сасноўка Бярозаўскага раёну, якія былі пабудаваныя паводле прэзыдэнцкай праграмы для адраджэньня беларускай вёскі.**

Гаспадарка «Аграфірма «Малеч» гэтыя васямнаццаць домікаў, пастаўленых у нізінным месцы сярод чыстага поля, здала ў арэнду сваім работнікам. Але памяшканьні не былі ўпарадкаваныя знутры. Не было ля домікаў патрэбных для вядзеньня хатняй гаспадаркі памяшканьняў. Навасёлам трэба было браць у банку крэдыты, каб усё гэта зрабіць. На думку людзей, «прэзыдэнцкія домікі», зробленыя з тонкіх блёкаў, абагрэць няма ніякай магчымасьці. Кожныя 20 хвілінаў трэба падкідваць у топку катла дровы і торф, каб было трохі цяплей, чым на вуліцы, — і гэта без перабольшваньня. На адзін месяц дроваў трэба на 215 тысячаў рублёў. А заробак скотніка — 300 тысячаў. Крэдыты таксама трэба аддаваць.

Таму да гэтага часу, а домікі арандуюцца ўжо тры гады, не праведзеныя яшчэ ні газ, ні тэлефоны. Бо дзяржава прапанавала зрабіць гэта арандатарам за свае ўласныя сродкі. Каб правесьці газаправод і тэлефонную лінію ў чыстае поле, патрэбныя шалёныя грошы. І гэта пры тым, што, паводле дамовы з гаспадаркаю, гэтыя дамы ніколі ня змогуць перайсьці ва ўласнасьць тых, хто ў іх пражывае.

Калі да жабаў, што ўтульна пачуваюць сябе пад падлогаю дамоў і ў саміх пакоях (бо дамы пабудавалі ў нізіне), навасёлы з часам ужо прывыклі, то да выпрабаваньня холадам — не. Таму сям'я жывёлавода Ўладзімера Кандрацюка, у якой гадуюцца двое малых дзяцей, зьняла кватэру на 5-м паверсе мястэчка Малеч — цэнтральнай сядзібы «Аграфірмы Малеч».

Сям'я Сяргея Мацяша з трыма малымі дзецьмі купіла ў вёсцы Сасноўка стары апусьцелы драўляны дом.

Цяпер яшчэ дзьве іншыя сям'і падбіраюць сабе прыдатнае жытло ў саміх вёсках. Яшчэ два катэджы стаяць пустыя — няма ахвотнікаў іх засяляць.

Так што праграма адраджэньня паміраючай вёскі Сасноўка такім будаўніцтвам няякасных домікаў, здаецца, правальваецца.

**Тамара Шчапёткіна, зь вёскі Сасноўка Бярозаўскага раёну.**

## Якаснае нядоўгае жыцьцё

**Водгук на артыкул Віталя Сіліцкага «Паненка NEW» («НН» №3'2008).**

Я не глядзеў навагодні выступ Лукашэнкі па тэлебачаньні, але калі ён сваю прамову чытаў на беларускай мове, то я гатовы зьесьці свой артыкул разам з газэтай, у якой яго надрукуюць.

«Відавочна, што ўлада імкнецца знайсьці новыя сродкі самалегітымізацыі і перафарматаваць свае стасункі з грамадзтвам...». Але спадар Сіліцкі, хутчэй, выказвае свае чаканьні, чым робіць лягічныя высновы з чарговай прамовы Лукашэнкі. Чаму я ўсумніўся ў высновах спадара Сіліцкага? Таму што, даруйце паўтор словаў аўтара, — «рыторыка і практыка — дзьве розныя рэчы».

Размова ня можа ісьці пра навязваньні «ўласнай вэрсіі «нацыянальнага» і «дыскрэдытацыі беларускага нацыяналізму». Размова ідзе пра вырошчваньне з насельніцтва, якое пражывае на беларускай тэрыторыі, новай гістарычнай супольнасьці, якая будзе агучваць інтарэсы нацыі (працаваць на выжываньне той нацыі). Той нацыі, на мове якой яна будзе размаўляць.

Таму «нацыянальны дыскурс» так і застаецца ворагам, якога зьнішчаюць, але новым чынам — падменай і падманам. А словы: «Мы — нацыя», «адзінай, згуртаванай нацыяй», «энэргічнай, моцнай духам» — гэта той самы стары прыёмчык перакананьня легкавернага насельніцтва.

Уяўляеце, якая мы нацыя, калі прадстаўляем інтарэсы суседняй дзяржавы. Вы калі-небудзь адстойвалі ў сваёй сям'і інтарэсы суседзкай жонкі? І якая «згуртаваная» сям'я ў вас выйдзе, калі вы гэта пачняце рабіць.

Згодны, што прага новых якасьцяў жыцьця (панагледзеліся, панапыта243іся) у сучаснай Беларусі спрычыняе канфлікты са старым ладам і з правіламі гульні. Пад новымі якасьцямі жыцьця сёньня насельніцтва Беларусі разумее павелічэньне памеру ўласнасьці, новыя паслугі, якасьць жытла і тавараў. А тое, што, здабываючы гэтыя матэрыяльныя каштоўнасьці, яно значна скарачае сваё жыцьцё (зьніжае жыцьцяздольнасьць), ня лічыцца зьніжэньнем якасьці жыцьця. Жыцьцё можа быць якасным, але нядоўгім (як у бройлера).

Падаўжэньне жыцьця людзей ня ўпісваецца ў эканамічную мадэль, якую ён сіліцца захаваць і якая зьяўляецца гарантыяй дзейнай улады. Для рэжыму нават лепш, калі людзі паміраюць, так і не зразумеўшы, чаго яны жылі і як павінныя жыць іхныя дзеці. Так прасьцей і лягчэй кіраваць. Вядома, пра пэнсійную сыстэму ня трэба клапаціцца, заадно мэдыцына будзе вымагаць менш выдаткаў. Для тых, хто пры ўладзе, адно дрэнна, што жывуць яны і іхныя дзеці не даўжэй за звычайных беларусаў.

Таму ёсьць адна надзея — на тое, што захочуць яны жыць даўжэй і пачнуць Бога пра гэта прасіць. А як гэта пачнецца, то, можа, даведаюцца, як Бог у Бабілёне людзей розуму вучыў. Менавіта так, гэта я зноў пра беларускую мову. Бог яе менавіта там нам даў, дзеля нашага беларускага выжываньня. Можа, ім раптоўна расхочацца саюзную «вежу» будаваць — марнаваць сваё жыцьцё і нашыя грошы. Вось тады, шаноўны спадар Віталь, і адкрыецца прастор для якасна новых грамадзкіх запатрабаваньняў.

**Віктар Абрамовіч, Магілёў**

## Паэтычны конкурс да 25 сакавіка

**Пра Вас яшчэ ня ведаюць як пра выбітнага творцу?** Вашых вершаў яшчэ не сьпявалі? Не друкавалі? Не дэклямавалі па радыё?

Час выпраўляць такую сытуацыю. Дасылайце пяць вершаў на конкурс, прысьвечаны 90-й гадавіне БНР, «Заклён на Волю» на **bnr90viersy@gmail.com** да 1 сакавіка і атрымайце прыз за 1, 2 ці 3 месца!

Дасылайце вершы на тэму свабоды і незалежнасьці (свабода і яе сымбалі, шляхі яе здабыцьця, незалежнасьць Беларусі, барацьба за незалежнасьць у мінулым стагодзьдзі і цяпер, Беларуская Народная Рэспубліка і яе выбітныя грамадзяне, ідэі БНР і г. д.).

Нават калі Вы не атрымаеце прызавога месца, Вашая творчасьць будзе шырока прэзэнтавацца праз мэдыі.

Бо Вашыя вершы будуць выхоўваць імпэт да Свабоды праз чыньнікі псыхікі і падсьвядомасьці, але не кандовымі лёзунгамі ды навязьлівымі маралітэ ці марнымі енкамі за «доляй няшчаснай» ды неактуальнымі апісаньнямі «хараства роднае зямелькі».

Бо Вашыя вершы, як чароўныя заклінаньні, выклічуць да жыцьця здані мінулага і, даўшы ім моцы, чарадзейнымі словамі скіруюць іх да змаганьня за Волю і Незалежнасьць цяпер.

Бо Вашая творчасьць дасьціпна пераадолее імпэрыятворчыя міты акупанцкай ідэалёгіі.

Бо ў Вашых творах Вы, спалучыўшы навуку з мастацтвам, перакладзяце знойдзеныя навукаю нацыятворчыя пастуляты на мову эмоцыяў і пачуцьцяў — зразумелую паспалітаму люду.

Бо дасьцё паспалітаму люду міты і сыстэмы маральных каштоўнасьцяў, якія выхаваюць веру ў Свабоду.

Пераможцаў будуць вызначаць да 25 Сакавіка Волаты Адраджэньня — філёзаф Валянцін Акудовіч, пісьменьнік Уладзімер Арлоў, культуроляг Максім Жбанкоў, літаратар Андрэй Хадановіч, паэтка Джэці, паэтка Віка Трэнас, паэтка Юлія Шастак, літаратарка і псыхоляг Эльза Волат, пясьняр і ўсяго патрона пан Скіргайла Палянэцкі-Мацкевіч

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Жыхары вуліцы Маркса бароняць свае гнёзды



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Ідэя сталічных уладаў адсяліць вуліцу Маркса ў самым цэнтры гораду выклікала прадказальны пратэст яе заможных жыхароў. У суботу каля кавярні «Грунвальд» сабраўся першы пікет. Каля 300 разьюшаных жыхароў, якія стаяць перад пэрспэктывай страты дзясяткаў тысяч даляраў на пераезьдзе ў спальныя раёны, выйшлі на вуліцу з транспарантамі «Александр Григорьевич, защитите пенсионеров».

Паводле задумы гарвыканкаму, вуліца Маркса мае стаць пешаходнай. Чыноўнікі задумалі пад шумок асвоіць каштоўныя кавалкі зямлі. Фармальнае права перасяліць жыхароў яны маюць — уласнасьць у Беларусі ня ёсьць недатыкальнай. Каб вызваліць месца пад гатэль з казіно — выпадак аналягічны з бэрнардынамі — яны маюць высяліць жыхароў з васьмі дзясяткаў кватэраў. Аднак калі на абарону старажытнага кляштара ўстала толькі жменька каталікоў і моладзі, на Маркса ўладам давядзецца мець справу з сотнямі абураных жыхароў.

У якасьці новае айчыны ім прапаноўваецца мікрараён Лошыца на ўскрайку Менску. Але цана квадратнага мэтра жытла на Маркса складае $3700 даляраў, а ў Лошыцы — толькі $2000. Дый рушыць зь месца, дзе жыццё пражылі, няма ахвотных.

Пратэст быў арганізаваны: «марксісты» загадзя нарыхтавалі плякаты.

Людзі ў натоўпе прысягалі, што «лягуць касьцьмі, але ня выедуць». Некаторыя зь іх набылі тут жытло нядаўна, нарабіўшы пазык.

Актыўны ўдзел у пратэсьце браў пісьменьнік Уладзімер Арлоў, што жыве тутсама. Ён трымаў плякаты «Толькі ў роднай кватэры напішу бэстсэлер». Іншы чалавек прыйшоў з цытатай з «Раскіданага гнязда»: «Ніхто нас адсюль ня згоніць і ня выстрашыць». Героі Купалы, як вядома, свайго котлішча не ўсьцераглі. Жыхары вуліцы Маркса спадзяюцца на лепшае.

Да пратэстоўцаў прыбылі намесьнік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёну Аляксандар Красуцкі, дырэктар УКБ Ленінскага раёну Леанід Казакоўскі і прадстаўнік «Менскпраекту» сп.Рыбнікаў. Чыноўнікі пераконвалі, што праект па высяленьні пакуль не зацьверджаны. У адказ мітынгоўцы паказалі чыноўнікам копію дакумэнту, у якім значыцца: «жыхары дамоў супрацьрэканструкцыі вуліцы... таму плянуецца іхнае высяленьне». Дакумэнт быў падпісаны тымі ж чыноўнікамі, якія прыйшлі на сустрэчу.

Пасьля кароткай паўзы чыноўнікі прапанавалі сустрэцца яшчэ раз «у спакойнай абстаноўцы».

**Яраслаў Сьцешык**

# Яшчэ адзін прызыўнік патрабуе беларускамоўнай службы

Адлічанага летась з Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту студэнта Юрася Алейніка зьбіраюцца прызваць у войска.

Хлопец вучыўся на факультэце дзяржаўнага кіраваньня эканомікай, але 15 траўня яго адлічылі з ВНУ. Афіцыйная прычына — «сыстэматычныя парушэньні вучэбнай дысцыпліны і правілаў унутранага распарадку». Сам хлопец лічыць, што гэта было зьвязана зь ягонай грамадзкай пазыцыяй.

Юрась спрабаваў адстаяць свае правы ў судах, аднак прадстаўнікі Фэміды ня сталі на бок студэнта. Увосень Алейнік зьехаў у Маскву, каб працягнуць навучаньне ў Дзяржаўным унівэрсытэце «Вышэйшая школа эканомікі».

Нядаўна хлопцу прыйшла позва ў маладэчанскі ваенкамат, каб прайсьці мэдычны агляд для прызыву ў войска. Камісію ў Маладэчне Алейнік прайшоў, але яго накіравалі на дадатковае абсьледаваньне ў Менск.

У ваенкамат Юрась прыехаў зь лістом ад кіраўніка Рады замежнай і абароннай палітыкі Расейскай Фэдэрацыі Сяргея Караганава, які адначасова зьяўляецца і дэканам факультэту ўсясьветнай эканомікі і міжнароднай палітыкі, дзе навучаецца Алейнік. Караганаў просіць даць хлопцу адтэрміноўку і прызваць яго ўжо пасьля сканчэньня курсу навучаньня.

«У ваенкамаце мне заявілі, што ніякіх падставаў даваць мне адтэрміноўку ў іх няма, — кажа Ю.Алейнік. — Сказалі, што ў зімовы прызыў я ўжо не трапляю па тэрмінах, таму нацягнуць боты давядзецца летам».

Алейнік спадзяецца ўсё ж давучыцца безь перапынку. «Калі ж не, то буду патрабаваць службы ў беларускамоўнай часьці, як гэта ўжо рабіў Зьміцер Жалезьнічэнка. Гэта ўжо ня будзе прэцэдэнтам, а будзе тэндэнцыяй, зь якой уладам давядзецца лічыцца», — кажа Ю.Алейнік.

**Зьміцер Панкавец**

# Дзякуй

**Андрэю Х.** зь Мёрскага раёну.

**Алене Дз.** з Наваградзкага раёну.

**Дз.П., Ігару К., М.Я., Ірыне З., Паўлу Н., А.А., Васілю Г.** зь Менскага раёну.

**Мікалаю Ш.** з Салігорску.

**Міхаілу Т., Юр'ю Л.** са Слуцкага раёну.

**Уладзімеру І., І.М., Ігару С., В.Ш., Яўгену К., Валерыі Ч., Уладзіславу Ж., Віктару В., Юр'ю Г., Адаму Ш., Любові С., Якаву Л., Зіне А., Вользе Ч., Рэгіне Д., Ірыне Л., Л.Л., Вадзіму Г., Галіне Р., Раісе К., Д.Д., Ф.Г., Віталю Ц., Мікалаю А., Марату К., Валерыі Ч., Уладзімеру З., І.З., Уладзімеру М., Ю.В., І.В., Л.К., Раісе К., Ніне К., Д.М., Віктару М., Ксеніі Ф., В.Б., Анатолю А., Івану Ф., Сьвятлане С., Міхаілу Л., Уладзімеру Ш., Аляксандру Р., Веры І., Валянціне Д., Натальлі Д., С.Р., Вікторыі Ш., Алене С., Валянціне Т., Н.Н., Марыне У., Валянціне Ш., Івану М., Яўгену І., Уладзімеру К., Элеаноры Б., В.К., Канстанціну Т., Віктару Д., Івану Б., Георгію М., А.Б., Міхаілу Ч., Алене Л., А.С., Пятру Т., М.Р., Генадзю Л., М.Г., Рэгіне К., В.Д., Юр'ю М., Алене М., Тацяне К., Аляксандру Н., Уладзімеру А., Аляксею С., Паўлу Л., Ільлі Н., Аляўціне В., А.П., Вользе Ж., І.М., Н.Р., С.К., Мікалаю У., Натальлі М., Сяргею К., Аляксею Ф., Анатолю П., Сяргею М., Ігару П., Сьвятлане Р., Г.П., Веры С.** зь Менску.


**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.

Замаўляйце кнігі сэрыі

«Кнігарня «Наша Ніва»

праз
**(029)505-39-11,**
**(029)126-36-87**

або праз e-mail:
**knihi@me.by**





## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Беліінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Беліінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

# Партрэт карабля

Гэты тэкст **Уладзімер Някляеў** напісаў для кнігі «Мікола Селяшчук. Гучаньне музыкі нябёсаў». Аднак у кнігу ён ня трапіў. Прычыны аўтару ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» не патлумачылі.

Памяць, як сіта: штуковіна зь дзіркамі. З гадамі шкадуеш, што ня вёў дзёньнікаў, не рабіў запісаў, пазначаных месцам і часам. Згадваеш пра тое, што было, — а дзе яно было, калі, зь якой нагоды?.. Тым ня менш, што-кольвечы не працадзілася ў нікуды, даволі дакладна разьмясьціўшыся ў часе і прасторы.

Зь Міколам Селешчуком блізка пазнаёміліся мы ў 1976 годзе, хоць на модных тады сэмінарах творчай моладзі (на адным зь якіх мяне ўразілі ягоныя літаграфіі з цыклю «Ваенная заалёгія»), на нейкіх выставах, на вечарынах паэзіі, вядома ж, бачыліся раней. Як і зь ягонымі суседзямі па *майстэрні над акіянам* — Уладзімерам Савічам і Ўладзімерам Тоўсьцікам. У маім сяброўскім коле ў той час было няшмат мастакоў, пераважалі літаратары, музыкі, сьпевакі, акторы…

Акіян людзей. Прыгожых, маладых, *несьмяротных.* Хто пра каго думаў пісаць успаміны?..

«Жыву над акіянам», — часьцяком казаў Селяшчук, і гэтаксама сказаў, калі я знаёміў яго з акторкай Сьвятланай Сухавей. І хоць мелася на ўвазе ўсяго толькі крама «Акіян», якая была (і ёсьць) у тым доме, на верхатуры якога месьцілася мастакоўская майстэрня, але прамовілася гэтае *жыву над акіянам* так, што ў вачах акторкі ўзьняліся хвалі. Сьляды іх, памойму, можна заўважыць на партрэце Сьвятланы Сухавей, напісаным Селешчуком ужо пад сярэдзіну 1980-х.

Яшчэ адна прыгожая акторка, Ларыса Зайцава, казала, што Селяшчук — магнэтычны…

Чым жа ён магнэтызаваў?

Была ў ім, па-першае, тая прыцягальная абаяльнасьць, пад якую чалавек падпадае адразу, — яшчэ нават ня цямячы, пад што падпаў. І, па-другое, умеў ён будзённае, крамнае ператварыць у стыхійнае, акіянічнае. Прыдумаць, намаляваць казку. А калі ты ўмееш такое, дык болей табе можна нічога ня ўмець…

У 1984 годзе ён стварыў «Казачны калейдаскоп», для якога сабраў, як каляровыя шкельцы, ці ня ўсё тое, што было раскідана па старонках прачытаных і аформленых ім кніг. Чаго там толькі няма: матылькі, карузьлікі, казюркі, напалову птушкі, напалову рыбы, напалову людзі… Там неба ў небе і неба на зямлі… Калейдаскоп гэты нават для тых, хто выпадкова ў яго зірне, дзіўны, а для таго, хто ведае хоць нейкія зь ягоных шыфраў, дзіўны ўдвая.

Неяк я распавёў Селешчуку гісторыю пра хлопчыка, які гадоў да дванаццаці нічога ня бачыў, апроч лесу, і нічога ня чуў, апроч казак. Ён быў сынам лесьніка, сям'я жыла ў лесьнічоўцы, і ягоны бацька казаў яму, што, апроч лесу, нідзе ў сьвеце і няма нічога.

Мне самому было трохі болей за дванаццаць, калі я спаткаў таго хлопчыка: мой бацька ўзяў мяне ў лес мох дзерці, хату зьбіраўся стаўляць. Да лесьнічоўкі мы невядома як, але дабраліся па нейкіх ваўчыных сьцежках на машыне — і хлапчук аслупянеў, яе ўбачыўшы. Пасьля, апалелы, бег за намі ці не праз увесь лес, праз увесь свой казачны сьвет, які — найперш, у ягонай сьвядомасьці — ламала і трушчыла жалезная казюрка на колах…

Зусім нечакана гэтая «апошняя пастараль» даволі моцна Міколу ўразіла.

— Калі хочаш ведаць, ты пра мяне расказаў! Я таксама помню, як аднойчы ўварвалася ў мой сьвет жалеза. Зь ягоным чужым пахам, колерам. Адно што не ў лесьнічоўцы гэта было, а на хутары. Той хутар быў для мяне ўсім сьветам, ніякага іншага сьвету я ня ведаў. Адтуль я ўвесь сам, адтуль усе мае карузьлікі і казюркі…

Тут надышла мая чарга ўразіцца, бо выглядаў ён чалавекам, які зусім натуральна, а значыць, нібы ад нараджэньня ўпісаны ў пэйзаж з гарадзкімі камяніцамі. Ва ўсякім разе, з такім чалавекам, як мне здавалася, я пазнаёміўся.

Пазнаёміліся мы ў майстэрні Аляксандра Кішчанкі, дзе па ўсёй падлозе былі расьсьцеленыя эскізы мазаікі, якая неўзабаве зьявілася на дамах па Ленінскім праспэкце — насупраць цяперашняга будынку Нацыянальнай бібліятэкі. Адным з эскізаў засьцяліўшы стол, Кішчанка паставіў кілішкі, кубкі і сказаў: «Чалавецтва падзяляецца на дзьве катэгорыі: адна п'е каву з каньяком, другая — каньяк з кавай. Вы да якой адносіцеся?..»

Мы аднесьліся да другой…

Помню, калі знаёміліся, ён, рукаючыся, трохі адхінуўся ўбок і назад, нібы аддаляючы позірк і ствараючы пэрспэктыву, у якой можна было б убачыць нешта яшчэ, апроч мяне, і белазуба расьсьмяяўся. Ня проста ўсьміхнуўся ветліва, як яно водзіцца пры знаёмствах, а ўголас расьсьмяяўся. Весела, адкрыта… Ні раней, ні пазьней не сустракаліся мне людзі, якія б, знаёмячыся, гэтак сьмяяліся…

Аляксандар Кішчанка, акрамя таго што быў бліскучым мастаком, меў яшчэ і талент фантастычнага апавядальніка. Фантастычнага ва ўсіх сэнсах — і найперш у тым, што амаль немагчыма было адрозьніць, што ў ягоных аповедах хаця ў нечым блізкае да праўды, а што — хаця ў чымсьці аддаленае ад выдумкі. Тым разам Кішчанка распавядаў пра сваё жыцьцё-быцьцё ў Кіеве ў адным жытле зь Сяргеем Параджанавым. Пра тое, што Параджанаў, як усялякі паўднёвы чалавек, выдаваў сябе за тонкага знаўцу ўсіх на сьвеце напояў, найперш, віна. І аднойчы прывёз гляк віна з Грузіі, сказаўшы, што ні Кішчанка, ні хто-небудзь іншы ў Кіеве такога боскага пітва не смакаваў, таму сёньня ён ладзіць вечарыну, каб хаця сябры іхныя той смакаты паспрабавалі і да скону за тое яму, Параджанаву, былі ўдзячныя. З тым і пайшоў кінарэжысэр Параджанаў на кінастудыю, а Кішчанка, пакуль Параджанаў працаваў і зьбіраў гасьцей, пабегаў па крамах, накупіў процьму рознай брыдоты, якая ў той час называлася віном, зьліў усё ў адзін тазік, дадаў цукру, мёду, спэцыяў, нагрэў гэты жудасны кактэйль на агні, астудзіў і напоўніў ім гляк, перад тым разьліўшы віно, якое ў гляку было, у пляшкі з-пад брыдоты. Вечарам зьявіўся Параджанаў з гасьцямі, пачаў з гляка наліваць, разам з усімі піць, смакаваць, пытацца: «Ну як?..» — і ўсе вочы закочвалі: «О, боскае віно!..» — а калі тое «боскае» скончылася і Кішчанка з пляшак з-пад брыдоты стаў наліваць сапраўднае, дык усе госьці, і першы Параджанаў, сказалі: «Якое г….»

З падтэкстам, між іншым, аповед. Ня просьценькі.

Пакуль Кішчанка распавядаў, Селяшчук, мусібыць, ад захапленьня лупіў і лупіў мяне пад сталом каленам у калена — і якраз у левае, траўмаванае, так што я ледзь трываў. Калі выйшлі, я спытаў, чаго ён біўся аб мяне, як яйка аб яйка, не Вялікдзень жа, і ён адказаў: «Для мяне кожны дзень — Вялікдзень».

Праз усё ягонае жыцьцё гэта не было так, нават зусім было ня так, але ўсё ж іншым разам ён так сябе пачуваў.

Не насядзеўшыся ў Кішчанкі, зайшлі ў кавярню.

Як толькі прыселі, я сказаў, што, калі б быў мастаком, дык першае, што б зрабіў, намаляваў бы ягоны партрэт, калі ён бе-

лазуба сьмяецца, і ён зноў расьсьмяяўся: «Намёк тонкі, але я ня дурань, зразумеў…»

Нельга сказаць, што мы раз і на ўсё жыццё пасябравалі, але сышліся лёгка, як вада з вадой. Так бывае рэдка — і толькі ў тых выпадках, калі здаецца, што душа ў чалавеку, зь якім даў Бог спаткацца, сьвятлейшая за ваду ў ранішняй, яшчэ не ўскаламучанай, рэчцы. Хаця была другая палова 1970-х, мне было трыццаць, яму ўсяго на год меней, і душы нашы ўжо не маглі быць не ўскаламучанымі — і такімі не былі…

Праз колькі гадзін, праведзеных у той вечар спачатку ў адной, пасьля ў другой і трэцяй кавярнях, стала зразумела, што я памыліўся ў першым сваім адчуваньні, прыняўшы яго за веселуна. Перада мной сядзеў клясычны адзінотнік. Адно што, дзякуй Богу, ня з тых адзінотнікаў, якія дастаюць сваёй адзінотай. Усё болей і болей аддаючыся натуры, ён зачыняўся, зачыняўся, пакуль ня шчоўкнуў замок. Ня маючы звычкі замкі ўзломваць, мы разьвіталіся, кожны кожнага пакінуўшы ў самім сабе.

Гады праз два ён напісаў карціну «Прыналежнасьць» — ці ня першую ў ягонай творчасьці («Хроніка аднаго вечара» і «Матылькі тут не жывуць» зьявіліся пазьней) выяву клясычнай, шчыльна замкнёнай у самой сабе, адзіноты. Прычым, адзіноты нібыта не ў адзіноце, а побач з гэткім жа, як і ты, боскім стварэньнем: з жанчынай, якая быццам бы блізкая, прызначэньне якой — рушыць сьцены адзіноты. Адзіноты ў кампаніі з тэлефонам, з гэтай прыручанай, а таму таксама нібыта блізкай, тэхнічнай прыладай, прызначэньне якой — па дратах прадзірацца ў неадзінотны сьвет. Але ніхто ня робіць тое, што павінен рабіць, не выконвае сваіх функцый, быццам для кожнага прадвызначаныя нейкія — ніхто ня ведае, якія — функцыі іншыя. Нібы прастору карціны (жыцьця) ён і яна *разам* запаўняюць выпадкова, не адно аднаму, а невядома каму прыналежныя…

Прыблізна гэтак я казаў яму пра карціну «Прыналежнасьць». Ён згаджаўся, што сутнасна мы ня толькі некаму, а нават самім сабе не прыналежныя — і нечакана згадаў даўні аповед Кішчанкі пра віно «боскае» і сапраўднае. Згадаўшы, стаў казаць, што сутнасьць таго, што мы робім, можа стаць падманкай, можа ня мець сутнаснага значэньня нават для нас саміх, калі мы не перакананыя, што за назвай зробленага ёсьць менавіта тое, што назва абазначае, што адно з адным супадае. Але добра: няхай сам ты перакнаўся, што вось гэта з гэтым супадае, а тое з тым — не, ды як пераканаць у тым іншых? І ці варта пераконваць, калі наша сутнаснае для ўсіх іншых — толькі назва, ім дастаткова толькі назвы. І яны як пілі, так і будуць піць, прыцмокваючы, г…, калі нехта назаве яго «боскім», і будуць ванітаваць ад сапраўды боскага, калі хтосьці назаве яго брыдотай. Абы нешта, віно ці г…, за гэтымі назвамі было — і нешта ж у кожным выпадку ёсьць…

Дзіўна, што так разважаючы (словы, можа, былі іншыя, але сэнс іх быў менавіта такі), ён раздражняўся, калі нехта, гледзячы на карціну, пытаўся: «А што тут намаляванае?..» І тую ж карціну «Прыналежнасьць» ён так «расказаў» адной нашай агульнай знаёмай, балерыне: «Вось гэтая — жанчына, вось гэты — мужчына, а во гэтае — тэлефон». Балерына, канечне, пакрыўдзілася.

Празь нейкі час і сам я выступіў амаль



МІКОЛА СЕЛЯШЧУК «ПАДАРОЖЖА Ў АФОН»

# Партрэт карабля

што ў ролі «балерыны». У 1983 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выходзіла мая кніга «Знак аховы», якую Селяшчук афармляў. Калі ён паказаў мне макет вокладкі, я спытаў: «А што ты тут намаляваў?.. Дзе тут я?..» Пытаючыся, я паспрабаваў падрабіцца пад «балетную» інтанацыю, але, дальбог, ня думаў яго пакрыўдзіць… Мне нават здавалася, што я жартаваў.

Ён ня стаў мне, як балерыне, тлумачыць: «Вось гэта…» Перавярнуў малюнак, паказаўшы чысты зварот — і ўсё.

Перад тым ён рабіў накіды мойго партрэту, і ў яго было некалькі маіх фатаздымкаў. Адзін зь іх ён і ўмайстраваў на вокладку замест малюнку. Сказаў: «Калі табе больш падабаецца глядзець на самога сябе, дык глядзі».

Прыйшоўшы наступным разам да яго ў майстэрню, я ўбачыў, што палатно са спробай майго партрэта загрунтаванае. Чысты зварот.

Такі вось, пры ўсёй зьнешняй мяккасьці, характар. Ці, можа быць, яму таксама здавалася, што ён жартаваў.

Мы не высьвятлялі адносін — проста нейкі час не сустракаліся. Можа, з паўгоду, пакуль Яўгенія Янішчыц не запрасіла нас абодвух у госьці, каб адсьвяткаваць выхад сваёй кнігі «Пара любові і жалю», якую таксама афармляў Селяшчук. У тыя часы зьяўленьне новай кнігі сапраўды было сьвятам.

Дома ў Янішчыц была і мая кніга «Знак аховы». Селяшчук узяў яе ў адну руку, кнігу Жэні ў другую, падняўся і спытаў: «Дзе тут я?..»

Ніхто, апроч нас, нічога не зразумеў…

Ня помню, хто, ці Жэня, ці Раіса Баравікова, у якой ці ня ў той жа год выйшаў у афармленьні Селешчука зборнік вершаў «Такое кароткае лета», спытала ў яго: «А чаму ты сфатаграфаваў Някляева, а не намаляваў?..» — на што ён адказаў, зьдзівіўшы калі ня ўсіх, дык мяне: — «Іх надта шмат, Някляевых, каб намаляваць аднаго». І прачытаў са «Знаку аховы»:

Мой родны!.. Бог табе судзьдзя.
Суды сабе падобных лепяць.
Якая песьня ў лебедзя?
Як лебедзь.

Канфлікт быў, што называецца, вычарпаны. Але да партрэта майго ён так і не вярнуўся, на тым загрунтаваным палатне ўзьнікла іншая карціна…

Калі Мікола Селяшчук стаў ляўрэатам Дзяржаўнай прэміі, я надумаў павіншаваць яго нечаканкай. Выраблялі мы іншым разам нечаканыя штуковіны, каб нясумна было. Заявіўся я да яго з грачанкай у белых строях, якія пенай спадалі зь яе плячэй да ног, ды яшчэ тая грачанка з кубкам, у якім пенілася шампанскае, — вылітая дачка Зэўса і Мнэмасіны. І хоць невядома, якая, бо ніводная зь іх дзевяці дачок багіняй жывапісу не была, затое родам тая грачанка з паўвыспы Халкідзікі, якая амываецца Эгейскім морам і на якой знаходзіцца, як вядома, Ágion Oros, то бок Афон, Сьвятая гара. Якраз у той час я марыў пабываць на гары Галгофа, а Селя, як называлі Селешчука сябры, на гары Афон — і падвучаная мной грачанка з Афону, зь якой я выпадкова пазнаёміўся ў офісе габрэя з прозьвішчам Эфрон, прапяяла, з рэверансам падаючы шампанскае і пенячыся белымі, спадаючымі строямі: «Калі Селя ня йдзе да гары, дык…»

Зусім незадоўга да сваёй трагічнай сустрэчы з Тырэнскім морам ён піша карціны «Загнаны анёл» і «Падарожжа ў Афон». Першая мяне ўразіла, я прыходзіў паглядзець на яе ня раз і ня два, бо яна была пра тое ж самае, пра што думалася і як адчувалася ў той час мне самому. Можа быць, з банальнай нагоды пяцідзесяцігодзьдзя: сумнаватай, хаця яшчэ нібыта і палётнай, як у таго анёла, пары падвядзеньня вынікаў. Калі ў апошні раз (ва ўсіх сэнсах апошні) выпівалі мы ня каву з каньяком, а каньяк з кавай, я сказаў, што з назвамі, канечне, заўсёды праблема. Кнігу, бывае, лягчэй напісаць, чым назваць. Гэтаксама, зразумела, і карціну, але чаму ўсё ж *загнаны анёл?* Ён глянуў на мяне, як мне здалося, сумнавата, нават з жалем: «Не назваць жа было *загнаны Някляеў...»* І ўбачыўшы, як я наструніўся, узіраючыся ў твар анёла, тут жа дадаў, белазуба ўсьміхнуўшыся: «*Ці Селяшчук…*»

Другая карціна, «Падарожжа ў Афон», ніяк мяне не зачапіла… З той простай прычыны, што я і не здагадваўся пра яе існаваньне, ён мне яе не паказваў. Ня ведаю, чаму… Магчыма, хацеў згуляць у нечаканку… І хаця і праз час, празь дзесяць год, але згуляў.

У 2006 годзе Фэлікс Янушкевіч, Уладзімер Тоўсьцік, Уладзімер Савіч, Георгі Скрыпнічэнка, Уладзімер Вішнеўскі ды іншыя сябры Беларускай Акадэміі выяўленчага мастацтва наладзілі выставу ў менскім гістарычным музэі, якая шчымліва нагадала мне знакамітыя выставы гэтых жа, тады яшчэ маладых, мастакоў на праспэкце Машэрава. Сярод іх твораў, выстаўленых у гістарычным музэі, я і ўбачыў упершыню карціну Міколы Селешчука «Падарожжа ў Афон». Прычым, каб не падвёў мяне да карціны, якая вісела ў ня надта асьветленым кутку, амаль адразу за дзьвярыма пры ўваходзе, Леанід Дранько-Майсюк, дык я б мог яе і ня ўбачыць…

…Паміж дзьвюма скаламі, адна зь якіх, мусібыць, Сьвятая гара з узьнесенымі на яе храмамі, як паміж Сцылаю і Харыбдай, — карабельчык. Ён пад ветразем, але пад такім, што ледзь вецер звархнецца — ветразь сарвецца. На карабельчыку кот, сабака, чатыры даволі дзіўныя мужчыны і адна ня менш дзіўная аголеная жанчына. Людзі гэтыя, як і прыручаныя імі зьвяры, быццам бы разам, бо ў адным карабельчыку, і ў той жа час яны — кожны паасобку. Настолькі асобна, што думаеш: калі раптам карабельчык пачне патанаць, то наўрад ці нехта некага стане ратаваць…

Карабельчык нібыта застыў на вадзе, і здаецца, што ніхто з тых, хто апынуўся на гэтым маленькім каўчэгу, ня ведае ні таго, куды плыць, ні таго, ці плыць нагул? Хаця з мора паміж скаламі вырастаюць чатыры кветкі, якія кожны з чатырох мужчын, паплыўшы, можа сарваць для жанчыны. Але не падобна, што ў падарожжа гэтае выбраліся яны па кветкі. На тварах іх адначасна і неспатоленасьць, і спатоля, і зблуканае сьвятло парываньняў, і цені стомы, і няўцямнасьць, і рэшткі надзеі… Паплылі яны, падобна, нават не дзеля таго, каб даплыць, падняцца на скалу і ўвайсьці ў які-небудзь з храмаў… Нейкая іншая ў іх мэта плаваньня, ці яе зусім няма… Альбо яна ўжо дасягнутая — і яны адплываюць… Над імі, на мачце, чатыры чайкі, гатовыя адляцець… І ўсё гэта разам: і чатыры мужчыны, і жанчына, і кот, і сабака, і чайкі, і кветкі ў моры, і зблуканае сьвятло парываньняў, і стома, і няўцямнасьць, і надзея называецца, як сьведчыць надпіс на борце карабельчыка, — *Ул. Някляеў.*

Адразу ўспомнілася: «Іх надта шмат, каб намаляваць аднаго…» І ажно горла перахапіла: «Ну, Селя…»

Жэст?.. Жэст — ды яшчэ які! Жэст сапраўднага мастака. Ня мог жа ён думаць, што разьвітальны.

Хто ведае: можа, падарожжа нашае сапраўды бясконцае — і ўсе мы яшчэ спаткаемся на карабельчыку, які плыве і да Сьвятой гары, і невядома куды… І, можа быць, спаткаемся мы ня толькі ўсе з усімі, але і кожны з самім сабой.

*2007, Вялікдзень.*

# Што зьмяняе чалавека

Пра загадку малавядомага фота Вінцука Дуніна–Марцінкевіча піша **Сяргей Харэўскі.**

Фатаздымак, зьмешчаны на першай паласе «Нашае Нівы» за 1910 год у № 48, да артыкулу «Ў 25-летнюю гадаўшчыну сьмерці В.Дуніна-Марцінкевіча», міжволі зварачае на сябе ўвагу нестандартным, малазнаным вобразам клясыка. Мы «звыклі» ўяўляць Марцінкевіча грузным, азызлым, нібы расьціснутым, якім ён паказаны на пазьнейшым здымку. Тут жа мы бачым энэргічны твар з высокім ілбом і ясным позіркам скрозь шкельцы элеганцкіх акуляраў. Подпіс пад здымкам сьведчыць, што на ім «В. Дунін-Марцінкевіч, з фатаграфіі, зробленай у Менску ў 60-х гадах».

Ці гэта насамрэч Дунін-Марцінкевіч? Выдаўцы «Нашай Нівы» браты Луцкевічы, якія прысьвяцілі творчасьці сталічнага культурнага героя нямала публікацыяў, памыліцца не маглі. Балазе, іхны бацька Ян Баляслаў быў у прыяцельскіх стасунках з аўтарам «Гапона». Луцкевічы ж, пэўна, як сябры рэдакцыі, маглі й прадставіць сам фатаздымак. Прыпушчаю, што з уласнага сямейнага архіву.

Хто мог быць аўтарам гэтага здымку?

Варыянтаў няшмат.

Першае ў сьвеце фотапартрэтнае атэлье ў Лёндане было адкрытае Рычардам Бёрдам толькі ў 1841 г., а Марцінкевічава «Сялянка» была напісаная ў 1844.

У 1860-я гады ў Менску былі фотамайстэрні Эмэрыка Адамовіча, Станіслава Антона Прушынскага і Якава Брафмана. Каб зразумець некаторыя акалічнасьці тагачаснае атмасфэры ў Менску, прывяду цытату з часопіса «Фотографическая иллюстрация», першага ў Расейскай імпэрыі часопісу фатаграфіі, апошні нумар якога (№ 8—9 за 1863 г.), выйшаў у Менску: «Дзьве адзіныя ў горадзе фатаграфіі, першая Прушынскага, даволі недасьведчанага фатографа, які карыстаецца падтрымкай польскага насельніцтва і ў цяперашні час арыштаваны за ўдзел у мецяжы, — другая Якава Аляксандравіча Брафмана, выдатнага фатографа, што заслугоўвае па майстэрстве сваім заняць найганаровейшае месца ў коле нашых расейскіх фатографаў».

Малавераемна, што аўтарам здымку Марцінкевіча мог быць Брафман. Пагатоў, нам дакладна ведама, што менавіта Прушынскі быў аўтарам здымку Дуніна-Марцінкевіча, вядомага сёньня кожнаму школьніку. Больш за тое, фатограф Антон Прушынскі 9 лютага 1852 г. выканаў ролю Караля Лятальскага падчас прэм'еры «Сялянкі». Дакумэнтальна пацьверджаны і факт існаваньня ў Менску фотамайстэрні Прушынскага ў 1861 г. Але, надта ж розьніцца здымак з «НН» 1910 году ад славутага фотапартрэта Дуніна-Марцінкевіча, на якім пісьменьнік апрануты ў вопратку зь цёмнымі палосамі, засьцянковую паўстанцкую чамарку…

Той першы мог быць зроблены Эмэрыкам Адамовічам. На адзіным дакумэнтальна атрыбутаваным ягоным здымку выяўлены апошні менскі біскуп XIX ст. Адам Вайткевіч. Стылістычнае й фарматнае падабенства са здымкам Дуніна-Марцінкевіча — відавочнае. Вядома, што Эмэрык Адамовіч быў выпускніком катэдры прыгожых мастацтваў пры Віленскім унівэрсытэце, і ад 1840-х выкладаў у Менскай мужчынскай гімназіі. Ягоная дачка Жазэфіна адчыніла ўласнае фотаатэлье ў Менску ў 1870-я.

Але як мог чалавек гэтак зьмяніцца? Згадаем жыцьцёвыя варункі. Пасьля таго як быў зроблены партрэт, друкаваны на першай старонцы «НН» у 1910 г., Дунін-Марцінкевіч больш за год правёў



**Здымак Марцінкевіча аўтарства Антона Прушынскага.**



**Фота В.Дуніна-Марцінкевіча, якое надрукавала «Наша Ніва» ў 1910 г.**

пад сьледзтвам у Менскім астрозе — па справе «О помещике Марцинкевиче, рассылавшем в Западные губернии возмутительные воззвания...» (1861). Пры канцы таго ж трагічнага для ягонае сям'і году дачку Марцінкевіча, Камілу, арыштавалі за «нядобранадзейнасьць». Доказам стаў фатаздымак таго ж А.Прушынскага, на якім Каміла зьнятая ў атачэньні патрыётаў у паўстанцкіх чамарках. Камілу зьмясьцілі ў вар'ятню, аднак пад напорам грамадзкасьці неўзабаве мусілі выпусьціць. Тады ж, дарэчы, арыштоўвалі і фатографа Прушынскага. Пасьля грымнуў 1863 год. У лютым Камілу зноў бяруць пад варту і высылаюць. У тым жа годзе, пасьля другога арышту, выехаў пад канвоем у Томск і А.Прушынскі.

А Дунін-Марцінкевіч, пасьля адседкі ў Пішчалаўскім замку (сёньняшняя «Валадарка») жыў пад пільным паліцэйскім наглядам «бяз тэрміну»… 12 гадоў ён правёў бязвыезна ў Люцынцы.

Выходзіць, што між двума здымкамі адлегласьць усяго пару гадоў! Цяжар жыцьцёвых клопатаў і беды, што абрынуліся на сям'ю Марцінкевіча, зьмянілі яго блізу непазнавальна…

Хоць пытаньне пра аўтарства «нашаніўскага» здымку застаецца адкрытым, дата не выклікае сумневу — 1860 год. А ці быў фатографам Эмэрык Адамовіч ці Станіслаў Антон Прушынскі высьветліць можна будзе толькі знайшоўшы арыгінал. І справа гэта не такая безнадзейная, як можа падацца. Да прыкладу, арыгінал «хрэстаматыйнага» здымку Дуніна-Марцінкевіча быў адшуканы наноў у фондах Дзяржаўнага музэю БССР толькі ў 1984 г.

# «Займаецца падробкай



Пра невядомы раней факт з жыцьця Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча піша літаратуразнаўца **Язэп Янушкевіч**.

Брычка звыкла падкаціла пад канцылярыю, і на раскацістае фурманава «Сто-о-ой!» гучна цокнулі ўсе дванаццаць падковаў. Тамаш гопнуўся зь передка і спрытна адчыніў дзьверцы.

Прыпсаванае надвор'е і верасьнёвы каламутны ранак не дадавалі гумору менскаму губэрнатару Сямёнаву. Аднак нічога не абяцала, што дзень выдасца гэткім тлумным.

Вылазячы, губэрнатар угледзеў постаць мужыка, што ўзьнікла між экіпажам і будынкам «прісутствія». Шарачковы армяк на фоне сьвежафарбаванай жоўтай сьцяны здаўся брудным. Наблізіўшыся, Сямёнаў пераканаўся ня толькі ў нясьвежай адзежыне. Маршчыністы пакамечаны твар гаварыў пра ўжываньне гары. Але чаканым перагарам не патыхала.



— Ваша Сьветласьць, маю пільную справу да…

— Ці быў у «прісутствіі»? Няхай складуць чалабітную.

Зь дзьвярэй казённага будынку ўжо шнураваў вартавы Рыгор Фалей. Губэрнатар ведаў, што загад ягоны пачуты і будзе выкананы належна.

— У мяне вельмі важнае, пра падробку дакумэнтаў на…

— А-а, калі так, тады адразу да Чмыхава.

Мужычок затрымаўся з Рыгорам, і губэрнатар прайшоў у дзьверы, кіруючыся проста да сябе ў кабінэт. Губэрнатарскія апартамэнты месьціліся на другім паверсе.

Якім жа было зьдзіўленьне, калі менш чым за паўгадзіны да яго пастукаліся і ўвайшоў сам Іван Чмыхаў. За плячыма віцэ-губэрнатара ў пройме была відаць знаёмая ўжо Сямёнаву постаць. Каб вось так, без належнага дакладу, віцэ-губэрнатар наважыўся турбаваць зраньня…

— Ваше Высочество, дело срочное, неотложное, требующее Вашего вмешательства...

Расейская мова з вуснаў віцэ-губэрнатара гучала бездакорна. Толькі мяккі сьпеўны акцэнт выдаваў ураджэнца поўдня Маларасіі. Так і было. Сын гарадавога магістратара дзесь з-пад Пераяслаўлю, Іван Хведараў Чмыхаў першыя гадоў дваццаць і служыў на радзіме — на Палтаўшчыне, падымаючыся ад сакратара ніжняга земскага суду праз павятовае казначэйства да губэрнскага рэгістратара. Найбольшым дасягненьнем ягонай маладосьці сталася служба ў крымскай саляной экспэдыцыі 1812 году, калі падчас нападу карсыканца на Расею ўвачавідкі, быццам сьнег увесну, таялі запасы солі. Гэты востры дэфіцыт народ мог і перачакаць, а вось царскае войска, падрослае на добрых 300 тысячаў апалчэнцаў, патрабавала ў варыва штодня хоць дробку тых крышталікаў, безь якіх і галоднаму страва не смакуе.

Векам Чмыхаў быў старэйшы за губэрнатара. Значыць, і досьведам чыноўніцкім багацейшы.

— Што здарылася? — Сямёнаў ссунуў бровы і ўнутрана сабраўся. Прадчуваючы, што зараз, бы генэралу на полі бою, давядзецца неадкладна прымаць рашэньне.

— Вось няхай раскажа ад пачатку. Заходзь! — Чмыхаў энэргічна махнуў рукою, ведаючы, што ад гэтай хвіліны зь яго здымаецца адказнасьць за пачутае. Што б цяпер ні набрахаў гэты прыгонны.

Спатрэбілася гадзіна, каб паўстала ясная карціна. Завуць яго Юзук Душкевіч, з прыгонных паноў Любанскіх-Клімантовічаў, што ў Мнішанах Пяршайскай воласьці. Поруч ляжыць Люцінка, ня больш як гады тры—чатыры таму набытая Вінцэнтам і Юзэфай Марцінкевічамі. Вінцэсь той падрадзіўся на

* Філют — шахрай; хітры, спрытны злодзей.

# дакумэнтаў»

арандатара Мнішанаў, а часткай платы за арандатарства старая Любанская аддала яго, Юзука, ды яшчэ сваячку ягоную, Юстыну, у «паслугу» Марцінкевічу, які, апроч Люцінкі, мае яшчэ і ў Менску дамкі. Вось, на Салдацкай Слабадзе жывучы, пасылаў яго гаспадар неаднойчы да Сьцяпана Ключынскага па нейкія паперы. Яно нічога, ды дзіва тое, што паперы тыя «белавыя», ніколі нічым не сьпісаныя. Але старадаўнія. З даўнімі гербамі, не цяперашнімі, з двухгаловым арлом… Дзе сам Ключынскі іх браў? Немаведама. Толькі ведама, што той Ключынскі раней служыў столаначальнікам у гарадзкім магістраце Менску. Стары, паважны чалавек. Нічога ніякага. А вось Марцінкевіч, філют*, сьпісвае іх, пад даўнія прывілеі каралеўскія падрабляючы. Бо паводле разбору, учыненага ўладамі пасьля Лістападаўскага закалоту, ніхто ня мае права лічыцца й называцца шляхтай, калі ня мае таго патэнту шляхецкага, каралеўскага. Дык Марцінкевіч прадае іх усёй шляхце, ня толькі губэрні Менскай, але й далей. Найбольш наяжджаюць сваякі-крэўнікі ягоныя з Магілёўшчыны ды Ашмяншчыны, ён іх на шляхту чысьцюсенькую врабляе, што потым ня толькі Герольдыя мясцовая, але і ў Пецярбургу правяраюць і за чыстую манэту прымаюць.

«Яшчэ адзін падпольны сындыкат», — мільганула ў Сямёнава. Зразумела, чаму віцэ-губэрнатар ня ўзяў адказнасьці на сябе. Тут, калі што ня так, да сталіцы рэха дакоціцца. І паздымаюць ордэны разам з пэнсіёнам. Не пасьпела аціхнуць справа вядомая з махляром Марцінам Чапкоўскім, ажно новая насоўваецца.

Году не мінула, як тую справу, пад амністыю падведзеную, у архіў сьпісалі. «…выробнік падложных дакумэнтаў Марцін Чапкоўскі ў Дзісенскім уездзе з паперамі падобнымі знойдзенымі ў сундуку злоўлены і на допытах у Дзісенскім земскім судзе 6-га а ў Мінску ў прысутнасьці паліцмайстра Чаглакова і чыноўніка Каменскага 10-га верасьня 1835-га году паказаў: пазнаёміўшыся з служачым ў Мінскай Рымска-Каталіцкай Духоўнай кансысторыі перакладчыкам Марцінкевічам, сьпярша склалі кампазыцыю на здыманьне мадэляў зь пячатак пад рознымі прывілеямі і дакумэнтамі, потым рабілі пячаткі Каралёў Польскіх Станіслава Аўгуста и Аўгуста 3-га. Сам жа ён Чапкоўскі зрабіў пячатку Караля Яна Казіміра, і ўсе оныя пячаткі засталіся ў Марцінкевіча…»

Той Чапкоўскі аціх, Сыбірам напалоханы, дык гэты не супакоіўся. Ну, галубчык, Сыбір за табою плача! Тады, як казалі, цесьць Бараноўскі, менскі рэгент, адмазаў зяцька. Цяпер ужо не адкруціцца, камэдыянт няшчасны. То «Рэкруцкі жыдоўскі набор» на кантрактах восеньскіх ставіць, то «Чарадзейную ваду» прыдумвае. Ясна, якая вада начамі гатуецца. Зь сінільных арэхаў ды кавы чорнай пад атрамант старадаўні робленая. Каб пісалася, быццам золатам па мармуры. Вось выпішу сходу ордэр на перагрус.

— Паклікаць сакратара!

Паслужлівы маладзён Вярбіцкі пудка прысеўшы за самім губэрнатарскім сталом, каліграфічна выводзіў пад дыктоўку.



«… У г. Мінску.
16 верасьня 1844.
№ 195.

Сакрэтна

Гаспадзіну чыноўніку асобых даручэньняў Буцевічу

Селянін памешчыка Любанскага Іосіф Душкевіч што знаходзіцца ва ўслужэньні у памешчыка Марцінкевіча зьявіўшыся да мяне гэтага дня, між іншага зрабіў мне данос, што Марцінкевіч займаецца нібыта складаньнем падробных дакумэнтаў на шляхецкае паходжаньне, для чаго мае і пячатку, схаваную пад падлогай.

Перадаючы зьнятае з Душкевіча паказаньне, даручаю Вам па ўказаньні данасіцеля зрабіць у доме Марцінкевіч раптоўны вобшук і супраць азначанага даносу зрабіць фармальнае дасьледаваньне і такое прадставіць мне…»

Накіраваны на Салдацкую Слабаду паліцэйскі нарад спраўна выканаў загад.

Толькі вынік — ну аніякі. Аніякія пячаткі ні ў сене, ні ў саломе, ні ў хаце пад падлогай, ні ў аўсе ў сьвіронку не адшукаліся. Папераў, праўда, тых назьбіралася. І сьвежых, і старажытных аркушаў. Толькі прыналежнасьць іх Дуніну-Марцінкевічу, шкодную ці не, яшчэ належала давесьці.

# Словы на вагу золата

У творах беларускай савецкай літаратуры прыніжэньне беларускага этнасу было вельмі яскравым. У творах XIX стагодзьдзя было бачна, што беларускі этнас жыве, што ён мае сілу і будучыню. Пра свой шлях да Дуніна-Марцінкевіча піша выдатны мовазнаўца **Фёдар Клімчук**.

Як успрымае той ці іншы чалавек таго ці іншага дзеяча культуры, гісторыі, залежыць ад гэтага чалавека, ад таго, які ён ёсьць. Таму мне неабходна некалькі словаў сказаць пра самога сябе.

Я — берасьцеец, нарадзіўся і доўга пражыў у глыбіні Берасьцейшчыны, у Драгічынскім раёне. Мая родная гаворка далёкая ад той, якая лягла ў аснову мовы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Але для мяне гэта не складала праблем.

На Берасьцейшчыне спрадвеку існавала культурнае шматмоўе. Гаварылі, праўда, там пераважна на адной мове — на берасьцейска-пінскай гаворцы. Але ж яшчэ трэба было разумець мову суседзяў і ўмець чытаць тэксты на некалькіх блізкіх мовах, якія бытавалі ў гэтай мясцовасьці.

Мае бацькі перад тым, як пасылаць мяне ў школу, навучылі мяне чытаць на чатырох мовах. Першай кнігай, якою я авалодаў, быў «Букварь» на расейскай мове. Другая кніга — «Чырвоныя зорачкі» на беларускай мове (гэта школьная чытанка). Трэцяя кніга — гэта «Петрусь Шкода» Міхайла Серады на ўкраінскай мове. Чацьвертая кніга — гэта школьны падручнік па прыродазнаўстве на польскай мове. Падарыла мне яго стрыечная сястра Марыя. Праўда, у гэтым падручніку я прачытваў толькі загалоўкі і тое, што было падпісанае пад малюнкамі і ілюстрацыямі.

Я кандыдат філялягічных навук. Але літаратура ў мяне «выпала». Як так сталася? Паводле першапачатковай спэцыяльнасьці, я — настаўнік гісторыі. Але потым захапіўся вывучэньнем народных гаворак і вырашыў паступіць у асьпірантуру па мовазнаўчым профілі. У тыя часы гэта не складала праблемы. Я самастойна падрыхтаваў філялягічныя, моўныя дысцыпліны, здаў экзамэны, прайшоў па конкурсе ў асьпірантуру. Такім чынам, маёй стыхіяй, акрамя гісторыі, стала мова. У сваіх дасьледаваньнях я стаў іх нават спалучаць. Гісторыя і мова, але не літаратура. Літаратура, як я гаварыў вышэй, у мяне выпала. Захавалася толькі тое, што засталося са школьных гадоў і кароткіх унівэрсытэцкіх курсаў.

Але ж мастацкія творы я чытаў, многа ці мала, але чытаў. Чытаў іх з аднолькавай лёгкасьцю на расейскай, беларускай і ўкраінскай мовах. З расейскіх паэтаў мне быў найбольш блізкім Някрасаў, з украінскіх — Шаўчэнка, зь беларускіх — Багдановіч. Хаця высока цаніў і іншых паэтаў і пісьменьнікаў. На польскай мове чытаць было цяжэй. Яшчэ цяжэй было чытаць на іншых славянскіх мовах. Але часам трохі чытаў і на іх, асабліва на чэскай і сэрбскай. На гэта, безумоўна, уплывала захапленьне слаўнай гісторыяй чэскага і сэрбскага народаў. Баўгарская мова мастацкіх твораў для мяне цяжэйшая за сэрбскую.

> Як спэцыяліст па Палесьсі, магу сказаць, што «Пінскую шляхту» напісаў жыхар паўднёва-ўсходняй часткі сучаснага Пінскага раёну.

Такім чынам, мастацкія творы я ўспрымаў ня як літаратар. Тады як?

А як звычайны чалавек, але не літаратар. Найбольш я цаніў у пісьменьнікаў і паэтаў іх **сілу думкі**. У гэтым сэнсе сярод паэтаў, якіх я назваў вышэй, мне найбольш падабаліся Багдановіч і Шаўчэнка. У іх што ні фрагмэнт фразы, то нешта настолькі арыгінальнае, дасканалае, дэталёва апрацаванае, што і паўтарыць нельга. На другім месцы я б паставіў **праўдзівае адлюстраваньне рэчаіснасьці**. Яна праяўлялася і ў побыце, і ў думках, і ў надзеях, і ў спадзяваньнях, і ў шчасьці, і ў горы. Чытаеш і адчуваеш, што гэта тое, што ёсьць ці было або магло быць. Адчуваеш месца і час падзей.

Пасьляваенны час. У школах Берасьцейшчыны беларуская літаратура, як і мова, вывучаліся. Але школьны курс літаратуры беларускай і расейскай адрозьніваўся істотна. У школьнай праграме па расейскай літаратуры было многа твораў дарэвалюцыйных паэтаў і пісьменьнікаў: Пушкіна, Лермантава, Талстога, Тургенева, Нікіціна, Майкава.

У школьных праграмах па беларускай літаратуры такога не было. У іх дамінавала ўхваленьне Сталіна, ўхваленьне савецкага ладу жыцьця. «Інфармавалася» пра жудаснае жыцьцё людзей да рэвалюцыі. Прапагандавалася думка пра тое, што беларуская літаратура мае толькі двух паэтаў: Янку Купалу і Якуба Коласа, астатняе — дробязь. Але зьмяшчалі пераважна толькі тыя творы Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія яны вымушаны былі пісаць на замову.

Нямала было твораў пра вайну. Але людзі таго часу ў абсалютнай большасьці самі бачылі ці прайшлі вайну. І заўважалі розьніцу ў тым, што бачылі самі і што пісалася ў творах.

Бытаваў тады такі анэкдот. Гаварылі, што экзамэн па беларускай літаратуры здаваць вельмі лёгка. Ну, вядома, нейкія імёны запомніць неабходна. Але галоўнае прытрымлівацца прынцыпу: «Цяжкае, жудаснае жыцьцё да рэвалюцыі — лёгкае, шчасьлівае жыцьцё пасьля рэвалюцыі».

Траплялася, праўда, і іншае. Напрыклад, славуты «Курган» Янкі Купалы. Дарэчы, на Берасьцейшчыне, паводле маіх назіраньняў, сярод беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў найбольшай павагай карыстаўся Багдановіч. Але гэта не мяняла сытуацыі ў цэлым. Дарэчы, «Курган» Янкі Купалы добра ўпісваўся ў агульную схему цяжкага жыцьця беларусаў да рэвалюцыі. Таму ён і трапіў у падручнік.

І вось я вучуся ў 7-ай клясе. Спачатку зьвярнуў увагу на творы Багдановіча. Яны вылучаліся з агульнага рэчышча. А потым трапілася наступнае. Вёска, у якой я нарадзіўся, згарэла ў час вайны. Цяпер там ёсьць сярэдняя школа. А пасьля вайны памяшканьня для школы не было. Было месца (у былой малачарні) толькі для пачатковай школы. З 5-й клясы я наведваў школу ў Драгічыне. Жыў там на кватэры. І вось, калі вучыўся ў 7-й клясе, жыў на кватэры разам з хлопцамі, якія вучыліся ў 8-й клясе. І ў іх быў падручнік па беларускай літаратуры для 8-й клясы. А гэты падручнік быў прысьвечаны дарэвалюцыйнай беларускай літаратуры. Мяне ён зацікавіў. Акрамя таго, за свае мізэрныя школьныя грошыкі я прыдбаў хрэстаматыю-дапаможнік па беларускай літаратуры XIX стагодзьдзя.

І я зрабіў для сябе вялікае адкрыцьцё. Перада мною паўстала зусім іншая Беларусь, зусім ня тая, якую падавалі нам у школьных падручніках.

У творах, зьмешчаных у падручніках, было многа нейкіх пустых словаў, словаў бяз пэўнага зьместу. А словы ў творах XIX стагодзьдзя былі на вагу золата. Хай

**Фёдар Клімчук**

кандыдат філялёгіі, найлепшы знаўца Заходняга Палесься і заходнепалескіх дыялектаў у краіне.



ІЛЮСТРАЦЫЯ ДА 1-ГА ВЫДАНЬНЯ «ГАПОНА» (1855)

там нешта з рыфмай ня так, хай там нярэдка значныя адрозьненьні ад літаратурнай нормы. Гэта ўжо неістотна. Там не ўхваляўся савецкі лад, які існаваў у сярэдзіне XX стагодзьдзя — у XIX стагодзьдзі яго яшчэ не было. Там не ўхваляўся Ёсіф Вісарыёнавіч — у самым канцы XIX стагодзьдзя, у 1900 годзе, яму быў усяго 21 год. Там не было перайначаньняў падзей Другой усясьветнай вайны — падзеі гэтай вайны надыдуць нямнога пазьней.

У творах XIX стагодзьдзя нямала пісалася пра цяжкае жыцьцё беларускіх сялян. Але пры гэтым не прыніжалася іхная чалавечая годнасьць. Яны фігуравалі як звычайныя нармальныя людзі. У творах жа з падручнікаў сярэдзіны XX стагодзьдзя прыніжэньне беларускага этнасу было вельмі яскравым. У творах XIX стагодзьдзя было бачна, што беларускі этнас жыве, што ён мае сілу і будучыню. Калі ж прачытаць творы з падручнікаў сярэдзіны XX стагодзьдзя, дык адчуеш у іх імкненьне даказаць, што беларускі этнас ня здольны нешта самастойна тварыць, што яго ў хуткім часе чакае... зьнікненьне.

Дунін-Марцінкевіч сваёй творчасьцю, поглядамі ўпісваецца ў агульнае рэчышча літаратурнага працэсу ў беларусаў XIX стагодзьдзя. Усё, што можна сказаць дадатнага пра беларускую літаратуру таго часу, можна сказаць і пра Дуніна-Марцінкевіча і ягоную творчасьць. Мне здаецца, і паўтарацць няма сэнсу. А што ў яго адметнага? Адметны, перш за ўсё, аб'ём працы. Калі ў многіх аўтараў невялікія фрагмэнты, то ў Дуніна-Марцінкевіча шырокія палотны адлюстраваньня беларускай рэчаіснасьці XIX стагодзьдзя. А разам з тым больш натуральна і больш глыбока адлюстраваная розная праблематыка. Ніхто зь беларускіх аўтараў XIX стагодзьдзя не напісаў столькі, колькі напісаў Дунін-Марцінкевіч. Ён — *клясык*.

Для мяне доўга заставалася незразумелай «Пінская шляхта». Калі я чытаў, напрыклад, «Залёты» ці «Гапона», дык нібы апускаўся ў тыповую беларускую рэчаіснасьць сярэдзіны XIX стагодзьдзя. Зь «Пінскай шляхтай» было ня тое. У ёй я не адчуваў ні тыповай цэнтральнай Беларусі, ні тыповай Піншчыны. Прычына выявілася пазьней. Аўтарам «Пінскай шляхты» зьяўляўся ня Дунін-Марцінкевіч, а нехта іншы. Дунін-Марцінкевіч толькі перапісаў гэты твор. У 1984 г. апублікаваны арыгінал «Пінскай шляхты» (В. Дунін-Марцінкевіч. Творы. Менск). Даецца інфармацыя, што твор напісаны «пінчуцкай гаворкай» (старонка 504).

Я, як спэцыяліст па народных гаворках Берасьцейска-Пінскага Палесься, пра мову гэтага твору магу сказаць больш канкрэтна. У аснове гэтай мовы ляжаць гаворкі паўднёва-ўсходняй часткі сучаснага Пінскага раёну Берасьцейскай вобласьці. Толькі «ў аснове», бо мова арыгіналу «Пінскай шляхты» не зусім ідэнтычная пінскім гаворкам. У гэтай мове адчувальны ўплыў традыцыяў афіцыйнай мовы эпохі Вялікага Княства Літоўскага. Хаця рэдка, але сустракаюцца ў арыгінале «Пінскай шляхты» звычайныя памылкі, якіх не заўсёды можна пазьбегнуць пры перапісваньні твору.

Такім чынам, ня ведаючы дасканала гаворак паўднёва-ўсходняй Піншчыны, немагчыма было стварыць «Пінскую шляхту». Я цікавіўся біяграфічнымі дадзенымі Дуніна-Марцінкевіча, спрабаваў знайсьці зьвесткі пра тое, якія былі ў яго асабістыя сувязі зь Піншчынай, якія б дазволілі яму дасканала засвоіць пінскую гаворку. Не знайшоў нічога. Праўда, у Дуніна-Марцінкевіча былі сувязі зь вёскай Альпень, што на Століншчыне. Але альпеньская гаворка да тыповых пінскіх гаворак не адносіцца. Гаворка вёскі Альпень адносіцца да гаворак так званага беражноўскага тыпу. Гэта пераходная гаворка паміж заходнепалескімі (берасьцейска-пінскімі) і ўсходнепалескімі (тураўска-мазырскімі) дыялектнымі сыстэмамі.

Зрэшты, «Пінская шляхта» — гэта асобная праблема. На агульную ацэнку творчасьці Дуніна-Марцінкевіча яна не ўплывае…




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Радзіма мая дарагая…

# Патрыятызм

Нацыянальна–дэмакратычны і культурны бамонд у залі Купалаўскага тэатру сабраўся 4 лютага далёка ня ўвесь: Вінцэнт Дунін–Марцінкевіч, дзьвесьце гадоў ад нараджэньня якога адзначылі спэктаклем **«Ідылія»**, не ўваходзіць у лік тых кананізаваных геніяў, на юбілей якіх не прыйсьці лічыцца непрыстойным. Але гледачы зусім і не шукалі знаёмыя твары на суседніх шэрагах. Усіх нашмат больш займала тое, што адбывалася на сцэне. Піша **Аляксандар Фядута**.

Уласна кажучы, гісторыя, расказаная гэтым азызлым з выгляду ўладаром фальварку Люцынка, простая і ў нечым нават банальная. Малады паніч Караль Лятальскі (Алег Гарбуз), што выправіўся жыць (ці вучыцца паводле нейкай тагачаснай праграмы) у той самы Парыж, вяртаецца на просьбу сваіх сялянаў, каб разабрацца з камісарам Выкрутачом (Аляксандар Гарцуеў), які іх прыціскае, карыстаючыся напоўніцу кантрактам... цьфу! прыгонным правам, вядома ж. Жыць сярод гэтых неадукаваных мужыкоў, што ня ведаюць нічога пра вадкае мыла, не разумеюць, у чым цымус сапраўднага «Гінэсу», і карыстаюцца туалетнай паперай, не нашмат мякчэйшай за наждак, — каму ж захочацца прамяняць Парыж на ўсё гэта? І пану Каралю таксама шчыра ня хочацца.

Але ягоная кузына Юлія (Зоя Белахвосьцік), што выдае сябе за сялянку Югасю, прымушае афранцужанага кузына закахацца ў сябе, прапанаваць руку і сэрца, заадно прагнаць камісара і палегчыць долю сялянам. У прыгожанькую «пэйзаначку» закахаліся ўсе запар, ад старога Выкрутача і да камэрдынэра Яна (Віктар Манаеў) і войта Навума Прыгаворкі (Аляксандар Кавальчук). Адным словам, усе шчасьлівыя.

Пастаўце гэтую немудрагелістую п'есу ў духу сьвятога для савецкай эпохі сацыялістычнага рэалізму, і ад нудоты памрэ ня толькі пан Караль, але і кожны глядач у залі. Чароўнасьць прыгоннага права мала хвалюе нашага сучасьніка. Але «Ідылію» ставіў Мікалай Пінігін — адзін зь нешматлікіх беларусаў, што валодае пачуцьцём гумару — то бок, здольны пасьмяяцца з самога сябе. І выявілася, што п'еса, напісаная паўтара стагодзьдзя таму, вельмі сучасная, можа прымусіць гледача рагатаць — і ня толькі рагатаць, пра што мы яшчэ скажам крыху ніжэй.

Пінігін прачытаў Дуніна-Марцінкевіча як беларускага Бамаршэ і прапанаваў Зоі Белахвосьцік сыграць гэткі сабе выбуховы сплаў чароўнай Сюзаны і вынаходлівага Фігара ў спадніцы. Белахвосьцік не баіцца выглядаць сьмешнай, яна атрымлівае асалоду нават ад пэўнага камікаваньня (асабліва гэта адчуваецца ў яе сцэнах з Гарбузам і Манаевым). Насуперак жанраваму вызначэньню, вынесенаму ў загаловак спэктаклю, гераіня зусім не пастаральная, не саладжавая. Яна падобная да тых тэатральных субрэткаў, на якіх стагодзьдзямі трымаецца рэпэртуар францускай камэдыі. У эпізодзе, дзе яна па чарзе (цалкам у духу Бамаршэ) прызначае спатканьні-пасткі адразу чацьвярым сваім залётнікам, Юлія-Югася ў інтэрпрэтацыі Зоі Валянці-

наўны дэманструе ўсю палітру жаночай абаяльнасьці, знаходзячы для кожнага каханка-няўдахі сваю непаўторную інтанацыю.

Нягледзячы на тое, што з усіх мужчынскіх пэрсанажаў больш-менш прапісаны характар хіба што Караля Лятальскага, вядучыя купалаўскія акторы ўмеюць зрабіць іх жывымі і сымпатычнымі. Скажам, у камісара Выкрутача (у бліскучым выкананьні Аляксандра Гарцуева), які, здавалася, без кіёчка ўжо няздольны быў і перасоўвацца, вырастаюць раптам крылы, і ён ужо ледзь ня лётае, пабачыўшы такую спакусьлівую Югасечку. Барвінкам віецца вакол недасягальнай «пэйзанкі» камэрдынэр Ян, што ўчора яшчэ пагарджаў беларускімі дзяўчатамі: слухаць, як заляцаецца Віктар Манаеў, — адна асалода! Здаецца, калі б рэжысэр знайшоў фарбы крыху мякчэйшыя для войта Навума, ня зводзячы ягоную ролю да набора прыказак, Лятальскі ў выкананьні Алега Гарбуза. Гэта вялікае дзіця, што сумуе па Парыжы, можа шчыра закахацца ў какетлівую сяляначку, на якую выпадкова трапляе, носіць фрак не па-мужчынску, а па-хлапечы, гатовы радасна пакрыўдзіцца на Радзіму пры першай жа магчымасьці. Не хацеў ён сюды вяртацца, бачыць Бог. Але давялося. Ці то праграма навучаньня скончылася, ці то грошы. І ён, цяжка ўздыхнуўшы, вяртаецца, каб выратаваць сваіх пэйзанаў ад дыктатара Выкрутача і аднавіць гістарычную справядлівасьць. Удваіх з камэрдынэрам Янам — яны дакладна Чып&Дэйл, якія сьпяшаюцца на дапамогу да тых, хто гэтага патрабуе. Такія сабе мульцяшныя пэрсанажы, вельмі добрыя і сымпатычныя. Вядома, Гаечка-Юлія мацнейшая за іх і больш тэхналягічная, але ж добрыя намеры — гэта таксама вельмі добра — праўда?!

Вельмі арганічна глядзеліся ўсе акторы ў вакальных нумарах. Ніхто не фальшывіў, але і ўласна опэрнымі іхныя галасы не назавеш. Таму да таго, што выраблялі акторы пад музыку, яны ставіліся з той жа самаіроніяй, што выратоўвала іх на працягу ўсяго спэктаклю. Яны «гуляліся ў клясыку», «гуляліся ў опэру» — а не спрабавалі з напружанымі выразамі твараў граць салідных опэрных сьпевакоў. У выніку напружаньня не адчувае і глядач — наадварот, атрымлівае шчырую асалоду.

Наагул, мне ўжо даводзілася пісаць, што ў беларусаў няма пачуцьця гумару, — дастаткова прыгадаць такіх тыповых нацыянальных пэрсанажаў, як Зянон Лукашэнка і Аляксандар Пазьняк. Тут жа — ці гэта Дунін-Марцінкевіч на актораў так паўплываў, ці гэта сам Пінігін — у добрым і цалкам карэктным гумары купаюцца і тыя, хто на сцэне, і тыя, хто ў залі. І разумееш пана Караля: вось на такую Радзіму сапраўды хочацца вярнуцца. Тут хамначальнік зазнае паразы, людзі ўсьміхаюцца і сьпяваюць ня толькі на Дажынках, але і на працы, а жанчыны лёгкія, прыгожыя і ня ведаюць, што такое «пікап». Тут добра. Лепш, чым у Парыжы.

Ды пры канцы спэктаклю сьмех раптам зьнікае. У паветраны шар сядаюць Караль і Юлія, Юлін тата і Ян. Зьлятаюць пад палянэз Агінскага — у сьветлае высокае неба. І раптам ідылія заканчваецца: гром, залева. Пусьцее сцэна. І толькі жаночы плач гаворыць пра тое, што шчасьце было такім магчымым, такім блізкім, але скончылася грымотамі і ўдарамі маланкі.

А яны ж зьляцелі і абяцалі вярнуцца... Мілыя, мілыя...

# з чалавечым абліччам

Аляксандру Кавальчуку было б крыху лягчэй, і ягоны герой выйшаў бы крыху менш падобным да маскі. Але і гэтаму таленавітаму актору ўдаецца зрабіць свайго алькаша і бабніка цалкам жывым і пазнавальным.

Але, хай мне гэта даруюць іншыя ўдзельнікі спэктаклю, найбольшыя сымпатыі гледача атрымаў Караль

**Аляксандар Фядута, глядач**

Хам-начальнік зазнае паразы, людзі ўсьміхаюцца і сьпяваюць ня толькі на Дажынках, але і на працы, а жанчыны лёгкія, прыгожыя і ня ведаюць, што такое «пікап».





# Barbastella barbastellus

У Берасьцейскай крэпасьці зімуе найбуйнейшая ў Эўропе калёнія кажаноў. Рэпартаж **Юліі Дарашкевіч**.

Тут іх сотні, яны вісяць дагары нагамі і зрэдку папіскваюць. Найбуйнейшая ў Эўропе зімавальная калёнія рукакрылых (Barbastella barbastellus, ці Шырокавушка эўрапейская — так называюць гэтых кажаноў навукоўцы) месьціцца на ўскрайку Берасьця, у старой фартэцыі.

Мы спускаемся ў скляпеньне разам з актывісткай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Марыяй Дзямянчык. Тут цёмна і вільготна. «Мікраклімат, як у пячорах» — кажа навукоўца. Размаўляем шэптам, каб не пабудзіць кажаноў.

Афіцыйна гэтае месца называецца «Біялягічны заказьнік «Барбастэла». Штогод на зімоўку сюды зьлятаюцца да трох тысячаў кажаноў. Навукоўцы назіраюць за імі ўжо гадоў дзесяць, аднак толькі нядаўна для рукакрылых абсталявалі «спальныя месцы» — на сьценах фартэцыі разьмясьцілі спэцыяльныя драўляныя шчыты. Прычапіўшыся да іх і зьбіўшыя ў купкі, кажаны й зімуюць. Выглядае гэта прыкладна так:





На нашую просьбу спадарыня Марыя выносіць некалькі жывёлак на паветра.

Кажаны аказваюцца зусім ня страшнымі, мілыя такія, пушыстыя зубасьцікі. Яны сонныя, каб раскатурхаць іх пасьля сьпячкі, трэба хвілінаў пятнаццаць. Але паляцець яны змогуць яшчэ ня хутка. Таму, добра разгледзеўшы рукакрылых, мы заносім іх назад у фартэцыю і чапляем за драўляны шчыток.

«Мае мышкі» — так пяшчотна называе сваіх гадаванцаў Марыя Дзямянчык. Навукоўцы рэгулярна праведваюць кажаноў, вядуць падлік і назіраньне. Апякуецца кажанамі й ААН — арганізацыя выдзеліла адмысловы грант на захаваньне зімавальнай калёніі. У Беларусі сем відаў кажаноў занесена ў Чырвоную кнігу.

# Валянцін Тарас пра...

### ...афіцыйны Саюз пісьменьнікаў

Была некалі так званая «руская сэкцыя» ў Саюзе пісьменьнікаў. У ёй сябраў было болей, чым ва ўсіх сэкцыях паводле жанраў. Гэта было такое аўтаномнае стварэньне, куды ўступалі расейскамоўныя пісьменьнікі. На пачатку 1950-х яна была скасаваная з ініцыятывы, здаецца, Броўкі. Расейская сэкцыя была шматлюднай, шумнай, прэтэнцыёзнай, але сапраўдных літаратараў там можна было пералічыць па пальцах: празаікі Барыс Бур'ян, Мікола Садковіч, паэт і перакладчык Навум Кісьлік. Астатнія не пакінулі сьледу ў літаратурным працэсе.

Не скажу, што гэтыя людзі варожа ставіліся да беларусаў, беларускасьці. Але яны, у большасьці сваёй, прыежджыя з Расеі, шчыра лічылі, што яны тут дома. Ім былі незразумелымі нашыя нацыянальныя праблемы.

Стаўленьнем да ўсяго беларускага і творчым патэнцыялам сёньняшні саюз, які ўзначальвае генэрал Чаргінец нагадвае мне тую расейскую сэкцыю.

Аўруцін, наваяўлены геній і ледзьве не надзея расейскай паэзіі, да нядаўняга часу абураўся, што расейскамоўных пісьменьнікаў тут у нас заціскаюць. Я запярэчыў яму артыкулам у ЛіМе, на які ён у сваю чаргу адказаў абсалютна нахабным, хамскім тонам, і я ня стаў зь ім дыскутаваць — апошняе слова засталося, нібыта, за ім.

У прадмове да яго апошняй кніжкі нейкі прафэсар Андрэеў напісаў, што Аўруцін — паэт больш значны, чым Іосіф Бродзкі. Вось, маўляў, каму трэба даваць Нобэлеўскую прэмію! А я пагартаў гэтую кніжку і ўпэўніўся, што гэта, так бы мовіць, адлюстраванае сьвятло: там многа перайманьняў з Валошына, наагул з паэтаў Срэбнага веку, Веніяміна Блажэннага...

У гэтым саюзе, вядома, ёсьць таленавітыя людзі — Раіса Баравікова, напрыклад. Але ў асноўным там «раёншчыкі»: людзі, якія навучыліся пісаць нешта падобнае на літаратуру. А яшчэ Міхаіл Сьвятлоў жартам гаварыў, што можа за невялікую плату вельмі хутка навучыць пісаць вершы, якія можна друкаваць у «Камсамольскай праўдзе». Вось і яны навучыліся пісаць так, што іх можна друкаваць у «Советской Белоруссии».


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### ...талент

Я асабіста ніколі нідзе не называю сябе пісьменьнікам. Я літаратар. Бо пісьменьнік — гэта Колас, Купала, Быкаў. Там гэтая цьвярозая самаацэнка часта зьнікае. І чалавек зь вельмі сьціплым дараваньнем лічыць сябе ўсясьветнай зоркай літаратуры!

Вось нядаўна адбыўся суд на пазоў Чаргінца да газэты «Новы час» і журналіста Аляксандра Тамковіча. Іх забавязалі сплаціць вялізныя грошы генэралу. У пазове Чаргінца ёсьць фраза: «Пра мяне як пра вядомага пісьменьніка, палітыка, генэрала-сэнатара ведаюць ня толькі многія грамадзяне і журналісты нашае дзяржавы, але і жыхары і прадстаўнікі СМІ з розных краінаў сьвету». Хочацца сказаць: «Дарагі Мікалай Іванавіч! У вас ёсьць пэўнае кола чытачоў, пэўная ніша ў літаратуры таго жанру, у якім вы працуеце. Але ў вас няма той вядомасьці, якая ёсьць у майстроў гэтага жанру — Ле Карэ, Сімэнона, Юліяна Сямёнава...» У Чаргінца ёсьць пэўныя здольнасьці — і ня больш. Але гэта ні ў якім разе яго не зьневажае, таму што маленькая яскарка — з таго самага рэчыва, што і вялікае полымя. Але гэта толькі яскарка, так Бог даў. Чалавек павінен гэта разумець, тым больш чалавек, якому вось-вось будзе семдзесят... Гэта тая самая хвароба, што ў Аўруціна: чалавеку ўжо за пяцьдзясят, а ён раптам адкрыў у сабе генія. У паэзіі ж, калі ты не адбыўся да 25, то ўжо і не адбудзесься... Вось так.

### ...папсу

Вельмі дыскрэдытуе паэзію папса. Ужо амаль немагчыма пачуць нармальную песьню!

### ... малыя наклады літаратуры

У часы СССР літаратура была ня толькі і ня столькі літаратура, колькі справа палітыкі, ідэалёгіі. Ніхто не глядзеў, купяць тваю кніжку, ці яна будзе сьпісаная. Гэта было вельмі зручна для пісьменьнікаў, але й заахвочвала графаманаў. Тады, можа, чыталі і больш, бо жыцьцё было застойнае...

Цяпер іншае стаўленьне да грошай, да літаратуры... Я магу і не чытаць Дантэ, але ў мяне мільёны, а ў цябе — вош на аркане... Цяпер літаратура прымушаная выжываць. І гэта добра. Вось хай выжывае тая літаратура, якую выдае «Мастацкая літаратура», і тая, якую выдаюць прыватныя выдавецтвы. Хай выжываюць. Я думаю, што, улічваючы нашыя ўмовы, нашыя культурныя, гуманітарныя і іншыя задачы, больш шансаў выжыць у нас, а ня ў іх. Бо менавіта мы стаім на нацыянальнай глебе. Мы, а не яны, выказваем галоўнае. Яны працягваюць жыць нейкімі хімэрамі. Вось зробяць саюзную дзяржаву — яны пачнуць славіць саюзную дзяржаву...

### ...маладых літаратараў

Авалодай хаця б адной мовай замежнай — той, што табе найбольш цікавая. І ня думай, што пераклады расейскія табе заменяць арыгіналы: будзеш тады глядзець на сьвет расейскімі вачыма. А табе гэта трэба?

### ...тое, за што сорамна

Калі я быў малым, да адыходу ў партызаны, мне даводзілася і красьці. Разам зь сябрамі мы залазілі ў які дом і бралі ежу, бо інача мы памерлі б з голаду. Будучы сталым чалавекам, я сабе гэта дараваў. Хай і Бог даруе.

Калі ўспомніць партызанку, то ёсьць рэчы, за якія мне ня тое што сорамна, мне страшна! Напрыклад, як я боты забіраў. Восень глыбокая, я босы. Хлопцы кажуць: вось, зараз у гэтай вёсцы, у гэтай заможнай хаце дабудзем табе боты. Прыходзім, просім. Гаспадар не дае. Ну, я і раззлаваўся. Карабінчык сарваў з пляча, крычу: дзядзька, давай боты, а то застрэлю! Вось за гэта мне цяпер страшна.

**Падрыхтавала Наталка Бабіна**

# Мяжа

## ВІНЦЭСЬ ВАШЭКА

### МЯЖА

Цягнік ідзе на Ўладаву.
Едзе дзядок самотны.
Пазірае на свой гадзіньнік,
Глядзіць у вакно...
— Станцыя Ўладава...
Сыходзіць, ідзе праз усю Тамашоўку
Туды, дзе ўзгорак над Бугам.
Стаіць і глядзіць за мяжу,
За драты і рэчку,
На сапраўдную Ўладаву.
На ўскраіне бачыць хату,
У якой нарадзіўся калісьці...

### * * *

Неба засланае хмарамі
Парэпанымі,
Падрапанымі.
Цёмна,
Цяжка.
Дыхаю з болем.
Божа, дай жа хоць прыгаршчы
Неба
Чыстага.

### КІТАЕЦ

Сяброўка мая, і каханка, і жонка —
Самота.
Мы зь ёю імклівую джонку
Возьмем,
Каб праз Жоўтае мора,
Ад жоўці людзкой зжаўцелае,
Пакінуць бераг,
І ў Ціхім,
Невытлумачальна ціхім,
Зьнікнуць
Акіяне.



Ружаны. Беларускі Калізэй

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

12 лютага
20.00

Менск
Графіці

# N.R.M.

·Акустыка·

Тэлефон:
(029) 254–49–09

Адрас:
зав. Калініна, 16

## КАНЦЭРТЫ

### metal fest

**8 лютага, а 17-й у клюбе «Рэактар» (вул.Харужай, 29)** пройдзе Heart of metal fest. Зайграюць гурты: **Medea** (Горадня), **Melodic black death doom metal frodmortell** (Заслаўе) і інш. Квіткі: 15.000 — танцпол, 20.000 — столік, 20 — танцпол у дзень канцэрту Т.: (029) 123–35–27, (029) 259–73–25.

### Стары Ольса

**14 лютага ў менскім Палацы прафсаюзаў** канцэрт гурту «Стары Ольса». Квіткі: ад 12000 да 28000. **Пачатак а 19-й.** Т.: (029) 326–24–25, (029) 766–24–25.

## ІМПРЭЗЫ

### Памяці Адольфа Янушкевіча

**10 лютага (нядзеля), а 15-й у Доме Ваньковіча (вул. Інтэрнацынаяльная, 33А)** адбудзецца вечарына, якая прысьвячаецца жыцьцю і творчасьці Адольфа Янушкевіча (1803—57), сябра Адама Міцкевіча і нават прататып аднаго з герояў ягоных твораў, удзельніка паўстаньня 1830—31 г., які пражыў у сыбірскім выгнаньні 25 гадоў, пахаваны на могілках у Дзягільне ля Койданава.

У вечарыне возьмуць удзел Адам Мальдзіс і Кастусь Цьвірка, прагучаць урыўкі з твораў А.Янушкевіча ў перакладзе Ганны Матусевіч. Будзе гучаць музыка першай паловы XIX ст.




### «Катынь» у Горадні

**8 лютага (пятніца) у Горадні** адбудзецца паказ фільму «Катынь» рэжысэра Анджэя Вайды. **Пачатак а 18-й, у памяшканьні Таварыства беларускай школы (вул. Будзёнага, 48а-44).**

### Прэзэнтацыя кнігі Вольгі Гапеевай

**8 лютага ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (вул.Фрунзэ, 19)** пройдзе прэзэнтацыя кніжкі Вольгі Гапеевай «Няголены ранак». У праграме — Адам Глёбус, Джэці, Зьміцер Вішнёў, Анка Упала, Ільля Сін, суполка «Яна-Тры–Ён», гурт «The ShkRobots», а таксама інсталяцыя вершаў.

## ВЫСТАВЫ

### Дунін-Марцінкевіч і Кастусь Каліноўскі

**На сядзібе Партыі БНФ** працуе выстава, прысьвечаная **170-годзьдзю Кастуся Каліноўскага і 200-годзьдзю Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча**. Дэманструюцца творы Аляксея Марачкіна, Міколы Купавы і Алеся Цыркунова. Уваход вольны.

### Палявое дасьледаваньне вёскі

**Да 15 лютага ў галерэі NOVA (Веры Харужай, 16)** працуе **фотавыстава Альберта Ціхановіча «Кола часу»** — своеасаблівае палявое дасьледаваньне будзённага жыцьця беларускай вёскі сярэдзіны 1990 — пачатку 2000–х. Гэта погляд чалавека, які ня першы год шукае адказы на адвечныя пытаньні: хто мы, адкуль мы, куды мы ідзем?

### Графіка Леаніда Шчамялёва

**7 лютага а 17-й у Нацыянальным мастацкім музэі** — адкрыцьцё пэрсанальнай выставы твораў жывапісу і графікі Леаніда Шчамялёва «Мастак і час», прымеркаваной да 85–годзьдзя майстра. **Выстава працуе да 10 сакавіка.**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**8 (пт), 9 (сб)** — «Вечар»
**10 (ндз)** — «Памінальная малітва»
**11 (пн)** — «Кім»
**12 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**13 (ср)** — «Сымон–музыка»
**14 (чц)** — «Таполевая завея»
**15 (пт)** — «Я не пакіну цябе»
**16 (сб)** — «Смак яблыка»
**17 (ндз)** — Паўлінка
*ранішія спэктаклі*
**10 (ндз)** — «Сьнежная каралева»
**17 (ндз)** — «Паўлінка»
*малая сцэна*
**8 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»
**9 (сб)** — «Маці»
**11 (пн)** — «Адчыніце Кантралёру!»
**15 (пт)** — «Варшаўская мэлёдыя»
**16 (сб)** — «Апэльсінавае віно»

### Тэатар беларускай драматургіі

**8 (пт), 13 (ср)** — «Сталіца Эраўнд»
**9 (сб)** — «Містэр Розыгрыш»
**10 (ндз)** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**10 (ндз)** — «Адвечная песьня»
**12 (аўт)** — «Нязваны госьць»
**14 (чц)** — «Жан і Бэатрыса»
**15 (пт)** — «Ганна ў тропіках»
**16 (сб)** — «Шлях у Царград»
**17 (ндз)** — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй»
**17 (ндз)** — «Сёстры Псыхеі»

### Тэатар юнага гледача

**9 (сб)** — «Залатое сэрцайка»
**9 (сб)** — «Апошняя дуэль»
**9 (сб), 10 (ндз)** — «Паліяна»
**13 (ср)** — «Таямніцы блакітных азёраў»
**14 (чц)** — «Палачанка»
**15 (пт)** — «Тарас на Парнасе»
**15 (пт)** — «Прыгоды Бібігона»
**16 (сб)** — «Шчаўкунок»
**16 (сб)** — «Шлях на Бэтлеем»
**17 (ндз)** — «Мешчанін у шляхецтве»
**17 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда»

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Астэрыкс, Абэлікс і Шумахер

**Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях**
(Asterix aux jeux olympiques)

Францыя — Гішпанія — Нямеччына — Італія — Бэльгія, 2008, каляровы, 120 хв.

**Рэжысэры:** Фрэдэрык Фарэст’е, Тама Лангман

**Ролі выконваюць:** Клявіс Карніяк, Жэрар Дэпард’ё, Ален Дэлон, Бэнуа Пульвардэ, Ванэса Геслэр, Зынадзін Зыдан, Міхаэль Шумахер

**Жанр:** Камэдыя

**Адзнака:** 5 (з 10)

Вольны гал Закаханікс марыць ажаніцца з грэцкаю прынцэсаю Ірынай. Але на Ірыну паклаў вока сын Юлія Цэзара Брут. Каб сарваць нежаданы шлюб і даць Закаханіксу шанец, Ірына абвяшчае, што выйдзе замуж толькі за пераможцу Алімпійскіх гульняў. Брут спадзяецца на посьпех, але ў Закаханікса найлепшыя настаўнікі — Астэрыкс і Абэлікс…

Папулярныя францускія пэрсанажы, якія сталі героямі коміксаў, анімацыі і фільмаў, чарговы раз на вялікім экране. Пасьля «Місіі Клеапатра» і «Астэрыкса і Абэлікса супраць Цэзара» — гэта трэцяя стужка зь непераможнымі і пацешнымі галамі. Клявіс Карніяк зьмяніў Крыстыяна Кляўе ў ролі Астэрыкса поруч зь нязьменным Абэліксам — Жэрарам Дэпард’ё.

Ален Дэлон грае самазакаханага імпэратара — і неўпрыкмет зьдзекуецца са сваіх мінулых каронных роляў (хто ведае, ацэніць жарт пра «Рока і ягоных братоў»). Радуе грымасамі Бэнуа Пульвэрду ў ролі прыдуркаватага Брута, які марыць атруціць бацьку.

Леапард губляе плямы, дыск разьбівае статуі, імчацца шалёныя коні, крычыць гратэскная публіка. А Зынадзін Зыдан і Міхаэль Шумахер удала працуюць на эпізодах.

Хаця стужка набыла ганаровы вялікабюджэтны «імпэрскі» статус (78 млн эўра), гэта не перашкодзіла «гальскай гісторыі» застацца жывой, пацешнай і мілай.

**Андрэй Расінскі**

## лІтаратурНы сшытак «НН»

люты 2008




**Партрэт карабля**
Уладзімер Някляеў пра Міколу Селешчука .......................... 18

**Што зьмяняе чалавека**
або Загадка малавядомага фота Вінцука Дуніна-Марцінкевіча. Піша Сяргей Харэўскі .......................... 21

**«Займаецца падробкай дакумэнтаў»**
Пра невядомы раней факт з жыцьця Дуніна-Марцінкевіча піша Язэп Янушкевіч .......................... 22

**Словы на вагу золата**
Пра свой шлях да Дуніна-Марцінкевіча піша Фёдар Клімчук .......................... 24

**Патрыятызм з чалавечым абліччам. Радзіма мая дарагая**
Пра юбілейны спэктакаль «Ідылія» піша Аляксандар Фядута .......................... 26

**Валянцін Тарас пра...** .......................... 29

**«Мяжа».**
Вінцэсь Вашэка .......................... 30


## КАЛІ Б...

**...у назвах менскіх вуліц была нейкая лёгіка.**




МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**Гід:** Шаноўныя турысты, мы знаходзімся на вуліцы Маркса. Вуліца названая ў гонар чалавека, які ў працах аб згоне сялянаў зь зямель ў сярэднявечнай Англіі вывеў прынцып, згодна зь якім цяпер улады перасяляюць жыхароў вуліцы Маркса ў Лошыцу.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**В.Кленікі Бельскага пав. Гарадз. губ.** У нашай вёсцы злавілі хеўру зладзяёў (5 чал.), каторыя ўжо два гады займаліся зладзействамі і абіралі ўсіх. Усе пяць — тутэйшыя мужыкі: Пётр Парфенюк, Эўфімій Цімафеюк, Марцін Трофімюк, Піліп Іванюк і Мацей Марчук. Гэты Марчук — той самы п'янюга, каторы радзіў мужыкам, замест даваць грошы на бібліятэку, купіць лепей псалтыр за 5 злотых. Добра яму гэтак радзіць — ён за той псалтыр, мусіць, нічога не аддаў бы, а хіба сьцягнуў бы дзе...

**«Наша Ніва» № 5, 1908**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЖЫТЛО

**Маладая беларускамоўная сям'я** зь дзіцем 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрацыя ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.:(029)198-32-51

**Прадам** за 51 тыс. цагляны дом плошчай 100 кв.м.(зроблены на 70%) з надзелам (6 сотак) каля Менску(1 км.). Ёсьць электрычнасьць, вада, падводзіцца газ. Т.: (029)576-74-29

### КНІГІ

**Прапаную кнігі** з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва», «Беларускі кнігазбор» (у тым ліку Мальдзіс), кнігі па генэалёгіі (многа), часопісы ARCHE, «Фрагмэнты», творы маладых аўтараў, многа іншага, дашлю сьпіс прапановаў. Т.: (029) 753-91-96. alesknigi@mail.ru

### ПРАЦА

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: (017)245-18-72, (029)101-03-24. Юры

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**«Замкі Беларусі».** 10 лютага (нядзеля) па маршруце: Менск—Мір—Наваградак—Любча—Шчорсы—Уселюб—Ліда—Менск. «Падольскія фартэцыі» 14—17 сакавіка па маршруце: Камянец-Падольскі—Хоцін—Меджыбож. Т.: (017) 292-54-58; (029) 622-57-20; (029) 509-12-16; (029) 110-19-28.


«Нашу Ніву» пытайцеся на сядзібе ТБМ кожны будні дзень ад 15.00 да 19.00


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.02.2008.

Замова № 694.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.